У ДЗЕДА 92 УНУКІ, ПРАЎНУКАЎ ПАКУЛЬ МЕНШ 6

ЖЫЦЦЁ Ў АБ'ЕКТЫВЕ МЭТРА 13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

22 КАСТРЫЧНІКА 2024 г. АЎТОРАК № 206 (30340)

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Самае галоўнае — каб нашы дзеці хацелі і маглі працаваць на сваёй зямлі»

Мінская вобласць паказвае годныя вынікі, але Прэзідэнт арыентуе на большае

Фота БелТА.

У цэнтры ўвагі ў цэнтральным рэгіёне — аграрыі. «Дажынкі» адсвяткавалі ў Мінскай вобласці, цэнтрам свята стаў Валожын. Па традыцыі ўдзел у абласным фестывалі-кірмашы ўзяў і Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік дзяржавы асабіста падзякаваў аграрыям за іх працу, узнагародзіў найлепшых. Падзякаваць сапраўды ёсць за што. Сёлета аграрыі Мінскай вобласці сабралі больш за 2,5 мільёна тон збожжа з улікам кукурузы і рапсу. Разам з кіраўніком дзяржавы яны падвялі вынікі гэтай уборачнай кампаніі і акрэслілі планы на будучыню.

Культуру земляробства трэба давесці да розуму

Найперш у Валожыне Аляксандр Лукашэнка падзяліўся сваімі назіраннямі з борта верталёта. Па яго словах, у цэлым па земляробстве крытыкаваць Мінскую вобласць няма за што. Аднак некалькі заўваг ёсць. «Усё ты рабіць умееш, але не робіш. Ведаеш, як апрацаваць прыфермерскія ўчасткі. Па маршруце няма да чаго прычапіцца. Ведаеш, як араць. Меліярацыю ўмееш рабіць як трэба. Дзе трэба, дровы ляжаць. Гэта сведчыць аб тым, што людзі нашы ўмеюць. Усё ўмеюць. Не горш, чым на Захадзе, дзе ўсё прыватнае. Але не заўсёды, не ўсюды ўсё робіцца. Таму ў наступным годзе жым будзе вельмі жорсткі: і па вымачках, і па азімым ячмені», — звярнуўся кіраўнік дзяржавы да старшыні Мінскага аблвыканкама Аляксандра Турчына. І паставіў перад рэгіёнам задачу давесці культуру земляробства да розуму.

«Засталося сабраць кукурузу. Але невялікія плошчы, збяром. Гэта значыць, умееш рабіць усё. Пажадана, каб гэта было ўсюды. Чаму не ўсюды — дысцыпліна. Усяго хапае, умеем рабіць, трактары, тэхніка. Але дысцыпліна дзесьці недацягвае. За зіму ўсіх трэба закруціць. Трэба працаваць так, як належыць», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Мінская вобласць — гэта Беларусь у мініяцюры

Настрой размовы з жыхарамі Валожына і ўсёй Мінскай вобласці быў больш святочны. Прэзідэнт прызнаўся, што рады сустрэчы на гэтай зямлі. «Па шматгадовай традыцыі, закладзенай на світанку незалежнай Беларусі, мы сабраліся разам, каб найперш пакланіцца вяскоўцам за працу і ўручыць заслужаныя ўзнагароды нашым героям», — сказаў ён.

СТАР. 2—3

«Алгарытм дзеянняў нашчупалі ў будаўніцтве і падтрыманні ў нармальным стане дарог. Засталося дзейнічаць»

У Палацы Незалежнасці абмеркавалі развіццё сеткі аўтадарог і транспартнай інфраструктуры

Прэзідэнту далажылі, як рэалізоўваюцца даручэнні ў гэтай галіне. У прыватнасці, ці ўдалося забяспечыць гадзінную даступнасць да гарадоў-спадарожнікаў. Акрамя таго, Аляксандра Лукашэнку цікавіла, як ажыццяўляецца Дзяржаўная праграма «Дарогі Беларусі», ці выконваецца яго даручэнне па ўзвядзенні дарог з цэментабетонным пакрыццём. Асаблівая ўвага падчас абмеркавання бягучых задач была ўдзелена пытанню рамонту дарог з інтэнсіўнай нагрузкай. Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на тое, што стан аўтамабільных дарог з'яўляецца найважнейшым пытаннем, якое ставіць перад уладай у тым ліку і насельніцтва Беларусі, і пашырыў тэматыку нарады, узняўшы праблему рассялення насельніцтва, якое імкнецца жыць і працаваць у сталіцы.

«У наступнай пяцігодцы пытанні гарадоў-спадарожнікаў мы павінны вырашыць»

«Я ўжо неаднойчы аб гэтым казаў, што перанасяленне Мінска — гэта не на карысць тых людзей, якія жывуць у Мінску, — патлумачыў Аляксандр Лукашэнка. — У тым ліку не на карысць тых, хто хоча прыехаць у Мінск. Мы бачым негатыўныя наступствы такіх з'яў па прыкладзе нашых суседніх дзяржаў. Практычна ў кожнай, але асабліва ў Маскве. Суцэльныя заторы, неабходнасць будаўніцтва ў вялізных маштабах развязак, дарог і гэтак далей. А што прыемнага для чалавека жыць у гэтым жалезабетонным «адзенні», і вакол — аўтамабілі, аўтамабілі, аўтамабілі».

У Беларусі абралі іншы шлях. Размова ідзе аб развіцці гарадоў-спадарожнікаў. Што датычыцца сталіцы, да іх адносяцца Дзяржынск, Заслаўе, Лагойск, Смалявічы, Фаніпаль і пасёлак Рудзенск. Там актыўна будуецца жыллё, якое людзі набываюць з задавальненнем. Паміж гарадамі-спадарожнікамі і Мінскам наладжаны добрыя транспартныя зносіны, аднак Прэзідэнт прапанаваў падумаць аб будаўніцтве больш хуткасных участкаў, якія не залежаць ад аўтамабільных дарог. Пры гэтым ён падкрэсліў, што гэта не зойме шмат часу і не патрабуе вялікіх грошай.

Аляксандр Лукашэнка прывёў у прыклад будаўніцтва наземнага метро ў Астане. Меркавалася, што чыгуначныя лініі будуць размяшчацца на жалезабетонных апорах, аднак праект аказаўся дарагім. «У нас што, ёсць такая неабходнасць? — зацікавіўся кіраўнік дзяржавы. — Не. Мы можам пабудаваць наземнае метро. Не будзем капаць, як крот, пад зямлёй гэтыя траншэі, а можам выйсці на паверхню ў канцы цяперашняга Мінска, яго контураў, і даехаць да тых жа Смалявічаў, Лагойска і гэтак далей. Я не думаю, што гэта па цяперашнім часе вялізныя грошы».

Пры гэтым Прэзідэнт заўважыў, што перанасычаць гарады-спадарожнікі ніхто не збіраецца. «Многія там і працаваць будуць, — канкрэтызаваў ён. — Мы, вядома, там і працоўныя месцы будзем стварацьАле некаторыя будуць імкнуцца прыехаць у Мінск на работу і па іншых пытаннях. Таму трэба стварацьнармальныя не толькі аўтамабільныя, але і чыгуначныя, іншыя зносіны».

СТАР. 3

КОРАТКА

• За тры месяцы па пашыраным бязвізе Беларусь наведалі каля 9 тыс. грамадзян з 35 еўрапейскіх краін.

• Каломенскі завод, які ўваходзіць у склад «ТМХ — Энергетычныя рашэнні», адправіў Беларускаму аўтамабільнаму заводу 20 рухавікоў для даследна-прамысловай партыі самазвалаў БЕЛАЗ-75304 грузападымальнасцю 220 т.

ISSN 1990 — 763X

Спецыяльны рэпартаж

ТЫСЯЧЫ ГАРАЧЫХ СЭРЦАЎ УДЗЕЛЬНІКАЎ «МАРАФОНУ АДЗІНСТВА»

«Ёсць чым ганарыцца, што захоўваць і дзеля чаго змагацца!»

Дзясяткі тысяч гамяльчан і гасцей абласнога цэнтра аб'яднаў «Марафон адзінства». Гомель першым з абласных цэнтраў прыняў эстафету рэспубліканскай грамадска-культурнай акцыі. Адкрыццё выставак і арт-аб'ектаў, экскурсіі, сустрэчы, квэсты і, вядома, тэатральна-канцэртная пастаноўка «Час выбраў нас» — двухдзённая праграма акцыі ўражвала насычанасцю і маштабнасцю.

«Марафон — гэта пра патрыятызм»

У першы дзень марафону яго ўдзельнікі — блогеры і члены творчых калектываў з іншых абласцей, якія ў пераважнай большасці ўпершыню прыехалі ў Гомель, — наведалі шматлікія лакацыі: ад вытворчых цэхаў прадпрыемстваў да ўстаноў адукацыі, культуры, навукі.

СТАР. 8—9

«Самае галоўнае — хацелі і маглі працаваць

Фота БелТА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што Міншчына — рэгіён незвычайны. Яе землі знаходзяцца ва ўсіх прыродных фізіка-геаграфічных зонах краіны, уключаючы Палессе і Паазер'е. «Вобласць — гэта практычна Беларусь у мініяцюры. І, з пункту гледжання земляробства, вы на практыцы ведаеце патэнцыял урадлівасці, плюсы і мінусы ўсіх нашых глеб і палёў. І ўмела свае веды выкарыстоўваеце», — падкрэсліў ён, яшчэ раз адзначыўшы, што тут умеюць рабіць усё.

«На Міншчыне размешчаны возера Нарач і Нацыянальны парк «Нарачанскі», Бярэзінскі біясферны запаведнік, найвышэйшы пункт рэспублікі — гара Дзяржынская і 20 % сусветных запасаў калійных угнаенняў у Салігорску. Гэта толькі невялікая частка вашых прыродных багацццяў», — пералічыў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка зрабіў акцэнт на тым, што сёння Мінская вобласць — адзін з лідараў у прамысловасці і сельскай гаспадарцы. «Хоць калісьці мы стаялі ў прамым сэнсе «на ростанях», выбіраючы свой шлях. Мы вызначаліся, куды і як ісці, — нагадаў ён. — Развіваць прамысловасць, станавіцца аграрнай краінай ці ўвогуле распрадаць замежнікам савецкую спадчыну і засяродзіцца, як тады казалі, на нейкіх паслугах. Як я казаў, быць халуямі. Вынікі нашага выбару сёння бачаць усе: мы самі, нашы сябры і ворагі».

Прэзідэнт падкрэсліў, што ў Беларусі высокапрадукцыйны АПК, развітая горназдабыўная прамысловасць, машынабудаванне сусветнага ўзроўню, мадэрнізаваная нафтаперапрацоўка і многае іншае. «Нічога не разбазарана і не страчана. Мы прымножылі спадчыну наймацнейшага Савецкага Саюза, ператварыўшы гэты здабытак у нацыянальныя брэнды сучаснай Беларусі. Як нам гэта ўдалося? Дзякуючы людзям, якія жывуць на блаславёнай беларускай зямлі, іх мудрасці, цярпенню і, самае галоўнае, працавітасці. Яна дапамагала нам выжываць у любое ліхалецце. Родная зямля заўсёды давала сілы, хлеб і ўпэўненасць у будучыні», — заявіў беларускі лідар.

Па словах кіраўніка дзяржавы, поспехі краіны — гэта заўсёды калектыўная праца. Так было, так ёсць і так будзе. «І наш важкі рэспубліканскі каравай-2024 — агульная заслуга ўсіх рэгіёнаў нашай Беларусі. Хоць самы важкі кавалак — больш за 2,5 мільёна тон збожжавых і зернебабовых культур, кукурузы і рапсу — сёлета ўнесла менавіта Міншчына. Вы вырасцілі чвэрць ад цяперашняга каравая. А калі параўноўваць з сярэдзінай 90-х — гэта палова таго, што збіралі ўсёй Беларусі», — падкрэсліў ён. Аляксандр Лукашэнка прывёў і іншыя лічбы. Так, сярэдняя ўраджайнасць збожжавых (разам з кукурузай) у Мінскай вобласці сёлета дасягнула амаль 44 цэнтнеры з гектара. Гэта больш, чым у суседніх еўрапейскіх дзяржавах, звярнуў увагу Прэзідэнт. Найлепшыя гаспадаркі рэгіёна — «Гастэлаўскае», «Сноў», «Грыцкевічы», «Пяцігор'е» — намалацілі каля 100 цэнтнераў з гектара і вышэй. Па словах кіраўніка дзяржавы, гэта ўжо ўзровень сусветных лідараў. «Як я казаў, вы ўмееце рабіць усё», — заўважыў ён.

Цяпер у рэгіёне завяршаецца ўборка бульбы, кукурузы, нарыхтоўка кармоў (па 30 кармавых адзінак на сёння). Пасеяны азімыя культуры, як ніколі раней, у тэрмін. Выдатна паказаў сябе азімы ячмень — 45 цэнтнераў з гектара. «Павелічэнне яго пасяўных плошчаў у паўтара раза — правільнае рашэнне, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Малайцы, што заняліся кукурузай. Сееце больш за ўсіх у краіне. І аддачу найбольш атрымалі. Добрая работа з кармамі адразу дае прадукцыйнасць у жывёлагадоўлі. Да канца года будзе надоена па 7 тысяч кілаграмаў малака ад каровы. Найдастойнейшы вынік».

Аднак у той жа час Аляксандр Лукашэнка заклікае быць шчырымі: гэта толькі «сярэдняя тэмпература па бальніцы». «Вы здольныя на большае, — канстатаваў ён. — За спінамі лідараў мінскай «перапрацоўкі» (агракамбінат «Дзяржынскі», «Смалявічы Бройлер», «Вялес-Міт» і іншыя) яшчэ хапае прадпрыемстваў, якім неабходна ўзяць на сябе, мякка кажучы, павышаныя абавязацельствы».

Добрыя ініцыятывы трэба стымуляваць

Прэзідэнт паставіў перад вобласцю заданне на найбліжэйшы год — не менш як 3 мільёны тон, а на працягу наступнай пяцігодкі ўстойліва выйсці на 3,5 мільёна тон па збожжавых, зернебабовых, кукурузе і рапсе. «Гэта рэальная для вас лічба. Агратэхніка і рацыёны кармоў у вобласці, дзе ёсць «Беларускалій» і Беларуская нацыянальная біятэхналагічная карпарацыя, павінны быць проста ўзорнымі», — заявіў ён. Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ў савецкі час Мінская вобласць двойчы была ўдастоена ордэна Леніна менавіта за аграрныя паказчыкі. А 250 яе ўраджэнцаў сталі Героямі Сацыялістычнай Працы. Кожны трэці — за выдатныя поспехі менавіта ў сельскай гаспадарцы. У найноўшай гісторыі на Міншчыне два Героі Беларусі. Прэзідэнт выказаў спадзяванне, што «Залатая Зорка» яшчэ не раз зазэе на грудзях ураджэнцаў цэнтральнага рэгіёна.

«Нашы пункты росту — у кампетэнтным кіраванні, укараненні інавацый, жалезнай тэхналагічнай і вытворчай дысцыпліне. Наглядны прыклад таго, як можна падысці да справы з розумам, — сады «Спартан-агра» ў Маладзечне. Фермер — не сапернік, а партнёр для дзяржавы. Добрыя ініцыятывы трэба стымуляваць і даваць ім зялёнае святло. Мы павінны падтрымліваць эфектыўнага дзяржаўнага прыватніка. Але незалежна ад таго, дзяржаўнае гэта прадпрыемства або прыватнае, якасць вышэй за ўсё. Менавіта ў гэтым была мэта абвяшчэння 2024-га Годам якасці. Але мы неяк расслабіліся, не ўсё зроблена», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён анансаваў, што ў 2025 годзе якасці будзе ўдзелена прыярытэтная ўвага. Па яго словах, у гэтым залог як нашага эканамічнага росту, так і павышэння прэстыжу на сусветных рынках. А гэта грошы.

«Давайце выкладвацца па максімуме. Кожны на сваім месцы. Тады і вынікі будуць высокімі. Тады ў нас заўсёды будуць магчымасці павышаць заробкі і пенсіі, будаваць жыллё, дарогі і сацыяльныя аб'екты», — заклікаў кіраўнік дзяржавы. Ён звярнуў увагу, што ўжо нямала зроблена ў сферы аховы здароўя, адукацыі, жыллёва-камунальнай гаспадаркі, культуры і спорту. Міншчына, напрыклад, стала першай вобласцю, дзе ў кожным раёне ёсць свой басейн. «Калісьці мы ўвялі сістэму мінімальных сацыяльных стандартаў. Сёння прыйшоў час узняць іх на больш высокі новы ўзровень. Стварыць у райцэнтрах, аграгарадках, вёсках і пасёлках такія камфортныя ўмовы, каб людзі імкнуліся жыць, працаваць і гадаваць дзетак менавіта там. Каб туды ехалі з Мінска і вялікіх гарадоў. А не наадварот», — падкрэсліў беларускі лідар. Па яго словах, нельга сцягваць людзей у два-тры гарады ў краіне, а то і толькі ў Мінск. Тым больш што горкі досвед суседзяў паказвае, што гэта катастрофа для жыхароў тых гарадоў.

«Трэба зрабіць так, каб дзеці бегалі басанож па траве, дыхалі свежым паветрам, харчаваліся сваімі прадуктамі. І самае галоўнае, каб яны ў выніку гэтага не адрываліся ад роднай зямлі, не шукалі сваё шчасце недзе далёка, можа, нават за акіянам. І самае галоўнае, каб нашы дзеці хацелі і маглі працаваць на сваёй зямлі. Калі мы закладзём у іх з дзяцінства вось гэта жывое, сапраўднае, такія правільныя каштоўнасці, можна быць спакойнымі за лёс краіны!» — сказаў беларускі лідар.

Прэзідэнт шчыра падзякаваў усім, хто працаваў на палях і жывёлагадоўчых комплексах, у садах, на перапрацоўчых аграпрамысловых прадпрыемствах. «Сёння са сцэны «Дажынак» я запэўніваю, што Беларусь, якая пастаўляе харчаванне больш як у 100 краін свету, працягне рабіць усё, каб і ў іншых народаў былі смачныя, якасныя беларускія прадукты і высокія ўраджаі. Мы гэта ўжо робім, пачынаючы ад Афрыкі і заканчваючы Азіяй, — запэўніў Прэзідэнт. — Я жадаю ўсім вяскоўцам і гасцям фестывалю-кірмашу здароўя, шчасця і выдатнага настрою. Нехай гэтая ўрачыстасць натхняе вас на новыя здзяйсненні».

Мы будзем рабіць усё, каб вяскоўцам было лепей

Прынамсі, у святочны дзень былі тэмы, якія Аляксандр Лукашэнка адзначыў па-за рамкамі афіцыйнага выступлення.

«МАЯ ПРАЦА — МОЙ ДОМ. МАЯ СЯМ'Я»

Што галоўнае для мінскіх аграрыяў

Фота БелТА.

Святкаванне «Дажынак» абавязкова задасць аграрыям добры настрой на эфектыўную працу. У гэтым перакананы **міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Анатоль ЛІНЕВІЧ.** «Мы ўвесь час у руху наперад. А часам трэба спыніцца, узяць невялікую паўзу, паглядзець, што мы маем. І гэта падымае настрой. Хлеб ёсць, жывёлагадоўля развіваецца, тэхналогіі ідуць наперад. І гэта надае настрою ўсім», — сказаў ён. Анатоль Ліневіч зрабіў акцэнт на тым, што неабходна адзначыць людзей, якія штодзённа сваёй працай робяць краіну мацнейшай. Тым больш што эфектыўна працаваць у Мінскай вобласці аграрыі ўмеюць. Міністр расказаў, што сёлета яны ўнеслі ў рэспубліканскі каравай — 2,6 мільёна з 9,7 мільёна тон збожжа (разам з кукурузай і рапсам). «Гэта вельмі добры вынік. Мінская вобласць набліжаецца да трох мільёнаў. Ёсць яшчэ што ўбіраць», — адзначыў Анатоль Ліневіч. Ён падкрэсліў, што сёлета ў Мінскай вобласці добры паказчык дае кукуруза, якая дапаможа выйсці на яшчэ лепшы вынік. Тым больш што цяпер стаіць выдатнае надвор'е для ўборкі. І, як звярнуў увагу міністр, выдатнае надвор'е для таго, каб святкаваць тое, што ўжо зроблена.

У сваім выступленні Прэзідэнт заўважыў, што яшчэ ў 1990-х гадах немагчыма было ўявіць, што беларусы дасягнуць такіх вынікаў і, па сутнасці, будуць карміць увесь свет. Героі дня, якіх у суботу знайшлі дзяржаўныя ўзнагароды, працуюць у сельскай гаспадарцы не адзін дзясятак гадоў. І ім ёсць з чым параўноўваць.

Ордэн Пашаны ад кіраўніка дзяржавы атрымаў дырэктар філіяла «Астрашыцкі Гарадок» агракамбіната «Дзяржынскі» Аляксандр Юргевіч. Ён прысвяціў сельскай гаспадарцы 35 гадоў, з іх 25 кіруе прадпрыемствам. «Я адчуваю вялікі гонар за тое, што Прэзідэнт так высока ацаніў нашу працу. Гэта праца ўсяго калектыву, які дасягнуў высокіх вынікаў у раслінаводстве, паказаў ураджайнасць больш як 90 цэнтнераў з гектара. Нам трэба яшчэ шмат зрабіць у жывёлагадоўлі. Але, перакананы, усё атрымаецца. Залог поспеху — людзі і выкананне тэхналогій, у нас з гэтым праблем няма», — расказаў журналістам Аляксандр Юргевіч.

Святлана Васілеўская, начальнік цэха малочнай прадукцыі ААТ «Мінскі малочны завод № 1», узнагароджана медалём «За працоўныя заслугі», працуе на прадпрыемстве 19 гадоў. «За гэты час змянілася вельмі многае. Мы ідзём наперад. І сёння наша прадукцыя самая якасная, не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. І гэта вынік мадэрнізацыі, якую мы прайшлі, паляпшэння ўмоў працы. Але ж няма мяжы дасканаласці — расказала яна. Святлана Васілеўская прызналася, што ўзнагарода дасць ёй новых сіл на больш плённую працу. «Мая праца — мой другі дом, мая другая сям'я. І я гатова працаваць так, каб яна развівалася і паляпшалася».

Медалём «За працоўныя заслугі» ўзнагароджана і лабарант хімічнага аналізу вытворчай лабараторыі Слуцкага сыраробнага камбіната Сняжана Сініцына. Яна на заводзе працуе 35 гадоў. «Усё мяняецца ў лепшы бок. І я ганаруся, што працую на найлепшым прадпрыемстве свайго горада. Я ўвогуле ганаруся тым, што жыву ў цудоўнай Беларусі. У нас усё добра, усё смачна — дзеля нашых людзей», — прызналася яна.

Таксама медалём «За працоўныя заслугі» Прэзідэнт узнагародзіў галоўнага ветэрынарнага ўрача ААТ «Смалявіцкі райаграсэрвіс» Максіма Гаркавенку, галоўнага агранома сельскагаспадарчага вытворчага каапаратыва «Агракамбінат Сноў» Нясвіжскага раёна Аляксандра Шаманава, трактарыста-машыніста Барысаўскага камбіната хлебапрадуктаў Віктара Клешчанка і галоўнага эканаміста КСУП «Пяршаі-2014» Алену Скрундзь.

Нагрудны знак да ганаровага звання «Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь» Аляксандр Лукашэнка ўручыў дырэктару ААТ «Крутагор'е-Петкавічы» Юрыю Клімашу.

Спецыяльны ліст аб аб'яўленні Падзякі Прэзідэнта атрымаў кіраўнік сялянскай гаспадаркі «Спартан-Агра» Маладзечанскага раёна Ігар Абрамчык. У верасні гэта прадпрыемства наведваў асабіста Прэзідэнт. І, як адзначыў Ігар Абрамчык, нават праз месяц у калектыву, ды і ў яго самога не сціхлі эмоцыі ад той сустрэчы. І зноў такая вялікая ўзнагарода. «Рада ўся каманда. Мы разам прайшлі такі вялікі, доўгі шлях. І мы бачым, што ўсё было не дарма. Гэта ўзнагарода ўсёй каманды», — прызнаўся ён. Сакрэтам поспеху ён назваў сумленную працу. Сёння яблыкі «Спартан-агра» прадстаўлены ва ўсіх крамах краіны, вельмі любяць іх і ў Расіі, нават на Далёкім Усходзе. І стаіць задача не спыняцца на дасягнутым.

Спецыяльныя лісты атрымалі аператар машыннага даення ААТ «Кленавічы» Алена Авяр'янава, вадзіцель ААТ «Літвяны-Агра» Аляксандр Дзямух, трактарыст-машыніст ТАА «Шапчыцы-Агра» Міхаіл Жукавец, галоўны заатэхнік ААТ «Нестановічы-Агра» Шака Кейта, галоўны заатэхнік ААТ «Краснадворцы» Вольга Швед. Падзякі Прэзідэнта ўдастоены работнікі аграпрамысловага комплексу Смалявіцкага раёна, калектыў гаспадаркі «Усход».

Валерыя СЦЯЦКО.

каб нашы дзеці на сваёй зямлі»

І адказаў на пытанне, якое, па яго словах, хвалюе не толькі нашых людзей, а найперш збеглых: «Лукашэнка паехаў на «Дажынкі» — пачаў перадвыбарную кампанію».

«Запомніце, больш за ўсё, чаго б я не хацеў, каб гэта кампанія пачыналася. Так, мы, як гэта звычайна бывае, па-беларуску чыста, акуратна, на вачах усёй сусветнай супольнасці выберам свайго Прэзідэнта. Вы выбераце таго, хто гэтага заслугоўвае, з вашага пункту гледжання. Таму ніякай перадвыбарнай кампаніі. А калі яны лічаць, што нейкая перадвыбарная кампанія... Маю на гэта права. Я аб гэтым не кажу, аб перадвыбарнай кампаніі. Але як Прэзідэнт краіны, не чужы вам чалавек я вырашыў праехаць сёлета па ўсіх мерапрыемствах, звязаных не толькі з «Дажынкамі», — заявіў Прэзідэнт. — Мяне хвалюе іншае, па-чалавечы вам скажу. Можа, мне як Прэзідэнту і не прыйдзецца, не будзе магчымасці, прыехаць да вас, да вяскоўцаў, з якімі я заўсёды быў на адной хвалі, як у народзе кажуць. Да вас, людзей, якія ніколі не здраджвалі мне, якія зрабілі неверагоднае для краіны. Успомніце, на світанку нашага юнацтва нам паесці не было чаго. Адзінае, чаго хапала, талонаў. А на гэтыя талоны не ўсё купіш. Сёння мы стварылі, вы выканалі маё галоўнае патрабаванне — забяспечылі харчовую бяспеку нашай краіны».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў 1990-я гады немагчыма было ўявіць, што Беларусь будзе пастаўляць прадукты ў 100 краін свету. Але сёння наша краіна пастаўляе харчаванне і мінеральныя ўгнаенні ў больш чым 100 краін свету. «Мы гэта зрабілі! Вы гэта зрабілі! Дык абавязаны я вам падзякаваць за гэта? Абавязаны! Вось мэта, якую я стаўлю перад сабой, наведваючы кожны рэгіён, для таго, каб убачыць вас і ад усёй душы падзякаваць за той подзвіг, які вы здзейснілі. Вы павінны ведаць, што мы будзем рабіць усё, каб вяскоўцам было лепш», — сказаў беларускі лідар. Ён адзначыў, што ёсць пытанні з дарогамі, з жыллём. На практыцы дзейнічаюць праграмы, каб вырашыць гэтыя праблемы. «Для нашых сялян, ветэранаў, пенсіянераў мы зробім так, выпрацуем такія сістэмы, каб ніхто не быў абдзелены, каб старыя сябе не адчувалі абдзеленымі ў той дзяржаве, якую яны стварылі ўласнымі рукамі, — паабяцаў Прэзідэнт. — Вось і ўся канспіралогія. Я прыехаў да вас, у іншыя рэгіёны, каб нізка пакланіцца вам за той подзвіг, патрыятызм і адданасць, якія вы выдалі за гэтыя дзесяцігоддзі. Вялікі вам дзякуй!»

Заходнія краіны нам зайздросцяць

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў жыхарам Мінскай вобласці за працу і за падтрымку. «У перадвыбарчы перыяд усе здаюць экзамен. Калісьці я прыдумаў добрую формулу: не толькі дзейны Прэзідэнт, але і ўсе мы перад нашым народам здаём экзамен. Ды што там перад нашым народам: сёння засяроджана ўсё на Беларусі. Паверце, усё на Беларусі», — заявіў Аляксандр Лукашэнка. Ён расказаў, што пятніца для яго была непублічным днём, але вельмі цяжкім. «Вельмі складаныя, цяжкія, але цікавыя перагаворы з прадстаўнікамі заходніх дзяржаў. І я, размаўляючы з імі, разумею, наколькі яны ўважліва назіраюць за намі. Наколькі прыдзірліва яны шукаюць, вывучаюць нашы памылкі і нашы поспехі. І калі няма сродкаў масавай інфармацыі, яны гавораць сумленна і шчыра. Вы ведаеце (а найбагацейшыя краіны былі прадстаўлены), яны нам зайздросцяць. Зайздросцяць таму, што мы ўмеем працаваць, святкаваць. Мы знайшлі свой шлях развіцця і дастойна па ім прайшлі», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Беларускі лідар звярнуў увагу, што цяпер праходзіць шмат мерапрыемстваў, якія сапраўды аб'ядноўваюць краіну. Адно з іх — «Марафон адзінства», у рэалізацыю якога нямала сіл уклалі і жыхары Мінскай вобласці. Прэзідэнт параўнаў гэты фестываль з «Дажынкамі», толькі для прадстаўнікоў творчай інтэлігенцыі: «У нашых творчых людзей таксама цяпер «уборка», як я ім кажу: вы павінны парадаваць нашых людзей. Яны гэта робяць дастойна». Аляксандр Лукашэнка прызнаўся, што папрасіў правесці гэты марафон па краіне, каб паказаць: не толькі вяскоўцы, не толькі рабочыя, але і творчыя людзі вартыя працы рабочых і сялян. І як анансаваў кіраўнік дзяржавы, такіх мерапрыемстваў будзе шмат. Ён звярнуў увагу, што праходзіць яны будуць не толькі ў электаральны перыяд, а пастаянна, каб забяспечыць людзям працы добры настрой. «Жыццё наша такое: ад пасяўной да ўборкі. Не паспеў азірнуцца — зіма праляціць. І зноў трэба выязджаць у поле, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — У нас ёсць усё. А чаго няма — мы купім. Галоўнае — здароўе. Здароўя вам, вашым дзеткам, вашым блізкім. Дзякуй вам».

Мінская вобласць заўсёды падстаўляе плячо краіне

Падзякай Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь узнагароджаны працаўнікі аграпрамысловага комплексу Мінскай вобласці. Спецыяльны ліст кіраўнік дзяржавы ўручыў старшыні Мінскага аблвыканкама Аляксандру Турчыну. Губернатар падзякаваў Прэзідэнту за ўсебаковую падтрымку Мінскага рэгіёна. «Ваша патрабавальнасць і сённяшнія словы, што вы не будзеце нас крытыкаваць, — самая высокая ўзнагарода для нас», — пажартаваў кіраўнік Мінскай вобласці. Аляксандр Турчын падкрэсліў, што Міншчына заўсёды выконвае даручэнні кіраўніка дзяржавы. Адным з даручэнняў на гэты год было падставіць плячо ўсёй краіне. Губернатар запэўніў, што і яно выканана. «Сёлета рэкордны намалот рапсу — больш чым 300 тысяч тон. Мы намалоцім больш за 700 тысяч тон зерня кукурузы, у цэлым атрымаем агульны ўраджай 2,8 мільёна тон зерня. Мы разумеем, што нам ёсць куды імкнуцца», — адзначыў Аляксандр Турчын. Ён падкрэсліў, што Валожынскі раён багаты на таленты, а галоўныя таленты — людзі. І ў пацвярджэнне таго — падарунак Прэзідэнту ад жыхароў Валожынскага раёна. На памяць Аляксандру Лукашэнку падарылі макет яго роднай хаты, выраблены з будаўнічых матэрыялаў і кардону, які сваімі рукамі выканала педагог мясцовага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі. У Тыдзень бацькоўскай любові гэта асабліва сімвалічны падарунак, заўважыў Аляксандр Турчын.

Валерыя СЦЯЦКО.

г. Валожын.

«...Засталося дзейнічаць»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Кажучы аб перспектывах выкарыстання струннага транспарту ў напрамку гарадоў-спадарожнікаў, кіраўнік дзяржавы адзначыў, што падобных распрацовак у свеце шмат. Таму пастаўлена задача рухацца і ў гэтым кірунку. «І ў наступнай пяцігодцы пытанні гарадоў-спадарожнікаў, асабліва для Мінска, мы павінны вырашыць, — канкрэтызаваў беларускі лідар. — Гэта павінна быць асобная праграма або падпраграма ў праграме «Дарогі Беларусі». Мы ўсё роўна на наступную пяцігодку павінны мець такую праграму. Мэтай вялікай праграмы, як я ўжо заяўляў, з'яўляецца падтрыманне ў нармальным стане аўтамабільных дарог, міжнародных трас, асноўных рэспубліканскіх трас».

У прыватнасці, пад рэканструкцыю трапіць дарога ад Гомеля да Брэста (М-10), завершацца работы на трасе Полацк — Віцебск. «І практычна ўсё, — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. — Буйныя дарогі мы пабудавалі, з абласнымі цэнтрамі з Мінска маем добрую сувязь. З Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Уладзіміравічам Пуціным мы дамовіліся, што ў найбліжэйшы час абмяркуем пытанні будаўніцтва хуткаснай магістралі праз Беларусь з Масквы на захад. Да Брэста па меншай меры. Калі заходнікі захочуць у гэтым удзельнічаць, будзем да Берліна працаваць. Не — да Брэста і ў зваротным напрамку на ўсход. Гэта, можна сказаць, ужо пытанне вырашанае».

«Нам трэба раённыя цэнтры звязаць з аграгарадкамі»

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што аўтамабільныя дарогі не заканчваюцца міжнароднымі, рэспубліканскімі важнымі трасамі. Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што пасля будаўніцтва дарог ад Мінска да абласных цэнтраў была дамоўленасць прывесці ў нармальны стан усе дарогі ад абласных да раённых цэнтраў. «Я не думаю, што нам трэба будзе мець там чатырохпалосны рух, там пакуль яшчэ хапае (і не пакуль, а яшчэ надоўга) двухпалосных дарог, — лічыць кіраўнік дзяржавы. — Але нам трэба раённыя цэнтры звязаць з аграгарадкамі. Найважнейшае пытанне, калі мы хочам, каб людзі на сяле жылі і не былі пакрыўджаны. Яны гэтага заслугоўваюць, таму ў гэтай вялікай праграме трэба прадугледзець будаўніцтва дарог ад раённых цэнтраў да ўсіх аграгарадкоў. З аграгарадкамі на працягу года мы вызначымся, дзе яны будуць і якія (бо ідзе аб'яднанне гаспадарак і гэтак далей), пачнём будаваць гэтыя дарогі».

Пры гэтым Прэзідэнт адзначыў, што большая частка гэтых дарог ужо пабудавана. Пастаўлена задача прывесці іх у парадак — па аналогіі з дарогамі, якія звязваюць раённыя цэнтры з абласнымі.

Як удакладніў віцэ-прэм'ер Анатоль Сівак, у краіне засталося 300 кіламетраў дарог, якія маюць гравійнае пакрыццё.

«Гэта амаль нічога, — сказаў беларускі лідар. — Што такое 300 кіламетраў? Таму мы пабудуем з цвёрдым пакрыццём, а астатнія дарогі адновім. Вось гэта наша праграма. Вядома, ёсць буйныя пасёлкі, ёсць буйныя вёскі, яны звычайна знаходзяцца на трасах ад раённага цэнтра да аграгарадкоў. Там, дзе няма, прадугледзім таксама пад'язную дарогу з улікам перспектывы».

Дзяржавай на дарогі выдаткоўваюцца немалыя грошы. Таму крыўды накшталт таго, што дзесьці несвоечасова правялі ямачны рамонт, не зусім справядлівыя. «Трэба разумець, што мы трацім грошы, якія плацяць перавозчыкі, транспарціруючы грузы па асноўных магістралях міжнародных, па асноўных рэспубліканскіх дарогах, — патлумачыў Прэзідэнт. — Мы з іх бяром грошы і ўкладаем у дарожную сетку, у тым ліку з бюджэту. І калі мы не будзем асноўныя трасы падтрымліваць у нармальным стане, да нас ніхто не паедзе. Значыць, не будзе грошай увогуле на дарожнае будаўніцтва. Таму, вядома, людзі павінны разумець, што мы спяшаемся і перш за ўсё будуем, прыводзім у парадак і нейкі рамонт вядзём на гэтых асноўных трасах. Кожны год. І будзем гэта рабіць, бо яны прыносяць нам грошы».

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што на прыкладзе аграгарадка Вішоў Бялыніцкага раёна Магілёўскай вобласці ўсе моманты, звязаныя з добраўпарадкаваннем дарог у сельскай мясцовасці, былі агавораны. «Там вялікіх работ не трэба, — лічыць ён, кажучы пра невялікія населеныя пункты. — Ну паслухайце, і не ўсюды нам ужо ў гэтых пасёлачках завулкі трэба з цвёрдым пакрыццём імгненна рабіць. З часам зробім. Але трэба адсыпаць дарогу, каб можна было ў любы час года там праехаць, пад'ехаць і гэтак далей. Гэта значыць, мы ўжо алгарытм дзеянняў нашчупалі ў будаўніцтве і падтрыманні ў нармальным стане дарог. Засталося дзейнічаць».

«Будзем падтрымліваць усіх, хто жадае будаваць»

Кажучы аб дарожнай праграме на бягучую пяцігодку, Аляксандр Лукашэнка даручыў зрабіць яе такой, як па будаўніцтве.

«Мы таксама вызначыліся, як будзем дзейнічаць, — нагадаў аб прынятых раней рашэннях Прэзідэнт. — Арэнднае жыллё. Будзем падтрымліваць усіх, хто жадае будаваць. І трэба ўсё-такі нашых беларусаў павольна падштурхоўваць да таго, каб яны ў сёлах, вёсках перспектыўных або хутарах, дзе заўгодна, набывалі гэтыя ўчасткі (гэта ўсё ж такі амаль паўгектара ўчастак). А ёсць многія ўчасткі, дзе ніколі людзі не жылі, але там можна пабудаваць жыллё. І багатых людзей дастаткова. Небагатых, але ахвотных пабудаваць жыллё ў вёсцы, каб, як я ўжо казаў, дзеці іх па траве маглі хадзіць басанож кожны год. Трэба падштурхоўваць іх да гэтага і стварацъ адпаведныя ўмовы. Таму ў жыллёвай праграме на пяцігодку (яна павінна быць кароткай і зразумелай) мы павінны і гэта прадугледзець».

«Таму за вамі — гэтыя дзве найважнейшыя для насельніцтва праграмы, — ставячы задачы Анатолю Сіваку, даручыў кіраўнік дзяржавы. — Я ўжо не кажу аб вытворчай праграме, аб развіцці вытворчасці будматэрыялаў і іншага. Гэтага дабра ў нас хапае. Трэба падтрымліваць у нармальным стане».

Вяртаючыся да дарожнай тэмы, Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што людзі чакаюць дзеянняў улады ў гэтым кірунку. «Мы ім павінны шчыра сказаць: дзе мы будзем працаваць, што мы будзем рабіць, — канкрэтызаваў беларускі лідар. — Яны павінны разумець (з людзьмі патрэбна размаўляць), што мы за адзін год або за пяць гадоў усё не скопім, што хацелася б. Але вельмі многае зробім, і гэта трэба ў праграме прадугледзець».

«Мы павінны рабіць дарогі з бетонным пакрыццём»

Кажучы аб стане аўтамабільных дарог, міністр транспарту і камунікацый Аляксей Ляхновіч паведаміў, што за апошнія два гады вельмі шмат грошай укладзена ў дарогі. «Калі ў 2023 годзе мы зрабілі больш як тры тысячы кіламетраў дарог і 107 маставых збудаванняў шматлікімі відамі рамонтаў, то ў 2024 годзе гэтая лічба ўжо перавысіць пяць тысяч аўтамабільных дарог і 117 мастоў на іх», — канкрэтызаваў ён.

Па словах Прэзідэнта, у праграме дарожнага будаўніцтва трэба прадугледзець у тым ліку рамонт і аднаўленне мастоў. «Я не думаю, што нам шмат трэба будаваць новых мастоў, — лічыць Аляксандр Лукашэнка. — У нас там, дзе трэба, масты пабудаваны. Нават не ўяўляю, у якіх гарадах (Іх няма. — **«Зв.»**). Усюды аб'езды і заезды, як у Магілёве паўднёва-заходні абход. Мы зрабілі, людзі задаволены. Праз Магілёў трафік аўтамабільны не ідзе. І з поўначы, і з поўдня можна Магілёў аб'ехаць. Я не ўяўляю, які горад яшчэ мае патрэбу».

«Гомель просіцца», — сказаў Анатоль Сівак.

«Магчыма, і ўсё, — канстатаваў кіраўнік дзяржавы. — Таму нам трэба рэканструяваць масты. Яны ўжо старыя, іх нямала, яны невялікія ў асноўным. Таму трэба апярэджваць, а не чакаць, калі нейкі мост пачне разбурацца і ўвогуле абваліцца, таму гэта для нас вельмі-вельмі важна».

«Мы так і ідзём, — заўважыў міністр транспарту і камунікацый. — Робім капітальным рамонтам, не ўваходзячы ў будаўніцтва. Калі казаць па рэспубліканскіх аўтамабільных дарогах, то з 16 тысяч кіламетраў рэспубліканскіх аўтадарог звыш 1700 мы рознымі відамі рамонту зробім сёлета. Гэта фактычна ўдасканаленае пакрыццё».

«У нас, я паглядзеў, кожны год у параўнанні з мінулым падвойваюцца аб'ёмы фінансавання», — звярнуў увагу Прэзідэнт.

«Так, у параўнанні з мінулым годам аб'ём фінансавання падвоіўся, — пацвердзіў Аляксей Ляхновіч. — Таму і лічбы такія вялікія атрымліваюцца па рамонтных работах».

Аляксандр Лукашэнка нагадаў пра пастаўленую раней задачу. «Там, дзе толькі магчыма і немагчыма, мы павінны будаваць дарогі з бетонным пакрыццём, — акцэнтаваў ён увагу. — Бетон ёсць бетон. Я кожны дзень ездзіў па гэтай лагойскай трасе. Так, яна ўжо трэшчыны дала, ну дык яна больш за 50 гадоў эксплуатуецца. Дала трэшчыны, мы іх заліпілі, і нармальна. 10—15 % цэменту, мы дамаўляліся, будзем выкарыстоўваць на дарогі. Усё для гэтага ёсць. Таму ў гэтай праграме чырвонымі літарамі павінна быць вызначана: будаўніцтва бетонных дарог».

Вераніка КАНЮТА.

У ФАРМАЦЕ КАНСТРУКТЫЎНАГА ДЫЯЛОГУ

Дэлегацыя Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь з афіцыйным візітам наведала Лаоскую Народна-Дэмакратычную Рэспубліку

Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА правёў сустрэчы з кіраўніцтвам Лаоса і двухбаковыя сустрэчы з кіраўнікамі парламенцкіх дэлегацый. Таксама беларуская дэлегацыя прыняла ўдзел у 45-й Генеральнай асамблеі Міжпарламенцкай асамблеі Асацыяцыі дзяржаў Паўднёва-Усходняй Азіі і ў парламенцкім дыялогу з прадстаўнікамі краін — удзельніц МПА АСЕАН.

Падпісанне Мемарандума аб супрацоўніцтве паміж нацыянальнымі сходамі Беларусі і Лаоса.

«У нашых краін няма рознагалоссяў»

Як паведамілі ў прэс-службе Палаты прадстаўнікоў, 19 кастрычніка Старшыня Палаты прадстаўнікоў правёў сустрэчу з прэм'ер-міністрам Лаоса Санекасем Сіпхандонам. Ігар Сергяенка зазначыў, што Беларусь разглядае Лаос у якасці аднаго з ключавых партнёраў у рэгіёне АСЕАН. «У нашых краін няма рознагалоссяў у двухбаковым, рэгіянальным і міжнародным парадку дня», — сказаў Старшыня Палаты прадстаўнікоў і выказаў упэўненасць у тым, што адносіны паміж краінамі і ў далейшым будуць плённа развівацца. Удзельнікі сустрэчы асобна адзначылі важнасць пашырэння гандлёва-эканамічных адносін і рэалізацыі ініцыятывы лаоскага боку аб правядзенні чарговага пасяджэння Сумеснай камісіі па двухбаковым супрацоўніцтве. Ігар Сергяенка запэўніў, што беларускія прадпрыемствы зацікаўлены ў надзейных партнёрах у Лаосе і адкрыты да прапаноў па стварэнні сумесных вытворчасцяў. Беларусь гатова пастаўляць у краіну сухое малако, прадукты харчавання, лекавыя сродкі, мота- і вела-прадукцыю. У сваю чаргу беларускі бок зацікаўлены ў закупках натуральнага каўчуку для вытворцаў шын, у прамых пастаўках кавы і садавіны.

Таксама на сустрэчы былі агучаны перспектывы супрацоўніцтва ў сферах адукацыі і культуры. Акрамя таго, закрануты тэма ўзаемадзеяння дзвюх краін у рамках міжнародных арганізацый у мэтах прасоўвання ініцыятыў, накіраваных на ўмацаванне міру, стабільнасці і развіцця ўзаемавыгаднага раўнапраўнага эканамічнага супрацоўніцтва.

Двухбаковыя сустрэчы

Аб развіцці ўзаемавыгадных і дружалюбных адносін гаварылася і на сустрэчы Ігара Сергяенкі са старшынёй Нацыянальнага сходу Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам Чан Тхань Манам. Па словах Старшыні Палаты прадстаўнікоў, выбудоўванне і паглыбленне такіх адносін — прыярытэт знешняй палітыкі Беларусі. «Нашы краіны аб'ядноўвае агульнае імкненне да справядлівага светаўладкавання. Мы адданыя прынцыпу шматбаковасці і дыялогу ў міжнародных адносінах», — сказаў Ігар Сергяенка. Бакі таксама адзначылі высокі ўзровень кантактаў і актыўную дынаміку міжпарламенцкага дыялогу. Парламентарыі дзвюх краін актыўна падтрымліваюць і будуць працягваць падтрымліваць адна адну на міжнародных пляцоўках, перш за ўсё ў ААН, а таксама па лініі міжпарламенцкіх структур. Беларусь і В'етнам надалей нацэлены актывізаваць кантакты на ўзроўні парламенцкіх груп сяброўства, у тым ліку ў фармаце відэаканферэнц-сувязі.

Ігар Сергяенка таксама адзначыў, што наша краіна разглядае В'етнам як стратэгічнага партнёра, які будзе садзейнічаць нарошчванню беларускай эканамічнай прысутнасці ў Паўднёва-Усходняй Азіі.

20 кастрычніка Старшыня Палаты прадстаўнікоў сустрэўся з міністрам планавання і інвестыцый Лаоса Пхетам Пхампхіпхакам. На сустрэчы абмеркаваны пытанні развіцця ўзаемадзеяння Беларускай гандлёва-прамысловай палаты і Нацыянальнай гандлёва-прамысловай палаты Лаоса, а таксама дзейнасці беларуска-лаоскай сумеснай камісіі па двухбаковым супрацоўніцтве. «Беларускія тэхналагічныя магчымасці могуць у значнай ступені задаволіць патрэбы эканомікі Лаоса, — адзначыў Ігар Сергяенка. — Мы гатовы прапанаваць існуючыя веды і вопыт, асабліва ў галіне сельскагаспадарчага машынабудавання, вытворчасці грузавых і легкавых аўтамабіляў, падрыхтоўкі кадраў па ўсім спектры спецыяльнасцяў, запатрабаваных у вашай краіне». Таксама спікер пацвердзіў зацікаўленасць беларускіх таваравытворцаў удзельнічаць у міжнародных выставах і кірмашах, якія праводзяцца ў Лаосе і ў Паўднёва-Усходняй Азіі ў цэлым, і запрасіў лаоскіх партнёраў да ўдзелу ў аналагічных мерапрыемствах у Беларусі і іншых краінах ЕАЭС.

У гэты ж дзень адбылася сустрэча Ігара Сергяенкі са старшынёй Нацыянальнага сходу Лаоса Сайсамфонам Фамвіханам. Старшыня Палаты прадстаўнікоў адзначыў важнасць парламенцкага ўзаемадзеяння ва ўмацаванні і развіцці дружалюбных сувязяў, прасоўванні мірнага, аб'яднальнага парадку дня. «На долю Беларусі і Лаоса гістарычна выпала нямала выпрабаванняў. Таму мы не хочам войнаў. Наадварот, мы зацікаўлены ў паглыбленні беларуска-лаоскага гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, прасоўванні ўзаемных інтарэсаў на рынках краін ЕАЭС і АСЕАН у мэтах устойлівага развіцця», — падкрэсліў спікер. І дадаў, што гандлёва-эканамічныя адносіны паміж Беларуссю і Лаосам неабходна развіваць і ўзняць да ўзроўню палітычных.

Пацвярджэннем такога развіцця стала падпісанне Мемарандума аб супрацоўніцтве паміж нацыянальнымі сходамі Беларусі і Лаоса. Адна з мэт яго падпісання — наданне дадатковага імпульсу сумеснай рабоце па развіцці прававой базы двухбаковага супрацоўніцтва ў сферах узаемнай абароны сакрэтнай інфармацыі, прававой дапамогі па грамадзянскіх і крымінальных справах, экстрадыцыі, супрацоўніцтва і ўзаемадапамогі ў мытнай справе, у галіне культуры.

Міралюбівыя і стваральныя ініцыятывы

Далейшае развіццё тэма прасоўвання міралюбівага і стваральнага парадку дня атрымала ў выступленні Ігара Сергяенкі на першым пленарным пасяджэнні Генеральнай асамблеі. «Тэма 45-й Генеральнай асамблеі МПА АСЕАН нам вельмі блізкая. Прасоўванне міралюбівага стваральнага парадку дня Рэспубліка Беларусь разглядае ў якасці першараднай задачы міжпарламенцкай дыпламатыі. Мы выступаем за інтэграцыю і збліжэнне, а не за стварэнне штучных бар'ераў на шляху фарміравання бяспечнага і квітнеючага свету, — адзначыў Ігар Сергяенка. — Заклікаем парламентарыяў на ўсіх узроўнях міжнароднага дыялогу прасоўваць аб'яднальныя ініцыятывы, накіраваныя на ўмацаванне даверу паміж краінамі. У іх ліку — ініцыятыва Прэзідэнта Беларусі аб распрацоўцы Еўразійскай хартыі разнастайнасці і шматпалярнасці ў XXI стагоддзі па фарміраванні новай сістэмы калектыўнай бяспекі ў духу Сан-Францыска». Гэта калектыўны дагавор, у якім выкладзены прынцыпы будаўніцтва справядлівага сусветнага парадку, калі кожная дзяржава будзе мець не толькі права, але і практычныя магчымасці для ўстойлівага суверэннага развіцця і раўнапраўнага супрацоўніцтва».

Старшыня Палаты прадстаўнікоў таксама засяродзіў увагу ўдзельнікаў пасяджэння на ролі парламентарыяў у захаванні палітычнага дыялогу, умацаванні ўзаемасувязі і забеспячэнні інклюзіўнага росту, заснаванага на паступальным эканамічным развіцці і выкараненні сацыяльных дысбалансаў. Адзначыў ён і тое, што сёння расце напружанасць і канфрантацыя, узмацняюцца знешні націск, а спробы ўмяшання ва ўнутраныя справы суверэнных краін парушаюць сацыяльна-эканамічныя правы цэлых народаў і ствараюць сур'ёзныя бар'еры на шляху дасягнення Мэт устойлівага развіцця. Ігар Сергяенка заявіў, што Беларусь рашуча выступае супраць прымянення асобнымі дзяржавамі і іх блокамі незаконных аднабаковых абмежавальных мер, якія вядуць да парушэння традыцыйных ланцужкоў паставак, ускладняюць лагістыку і фінансавыя разлікі, негатыўна ўплываюць на перспектывы інклюзіўнага эканамічнага росту. Пры гэтым ён адзначыў, што Беларусь адкрыта для раўнапраўнага дыялогу і прагматычных узаемавыгадных адносін з АСЕАН.

Размова аб будучыні

Яшчэ адной значнай падзеяй у рамках Генеральнай асамблеі МПА АСЕАН стаў дыялог з дэлегацыямі парламентаў краін — удзельніц Міжпарламенцкай асамблеі на тэму «Парламенцкае супрацоўніцтва на шляху да інтэграцыі і інклюзіўнага росту». У сваім выступленні Ігар Сергяенка адзначыў важнасць парламенцкай дыпламатыі для падтрымкі намаганняў краін па развіцці міждзяржаўных адносін у інтарэсах захавання міру і даверу. Ён выказаў упэўненасць, што менавіта парламентарыі прадстаўляюць увесь спектр палітычных і грамадскіх сіл сваіх краін. І таму яны здольны больш гнутка падтрымліваць дыялог і наладжваць камунікацыі ў мэтах садзейнічання далейшай інтэграцыі і інклюзіўнаму росту.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў падкрэсліў, што наша краіна ў знешняй палітыцы прытрымліваецца прынцыпаў «эканамічнай дыпламатыі», у аснове якой — адкрытая эканоміка, спрашчэнне працэдур гандлю, імкненне выбудаваць узаемавыгадную мадэль супрацоўніцтва з усімі дзяржавамі. Зыходзячы з гэтага, Беларусь гатова супрацоўнічаць з краінамі АСЕАН па самым шырокім спектры напрамкаў. «Маючы істотны патэнцыял па экспарце калійных угнаенняў, малочнай і мясной прадукцыі, прадукцыі сельгасмашынабудавання, Беларусь пацвярджае гатоўнасць да доўгатэрміновага супрацоўніцтва з партнёрамі з Паўднёва-Усходняй Азіі ў харчовай сферы», — сказаў ён.

Блізкая ўлада

На прыём да сенатара ў сваім раёне

Як мы ўжо паведамлялі, у Савеце Рэспублікі было прынята рашэнне праводзіць адзіны дзень прыёму грамадзян у рэгіёнах краіны кожны месяц. У кастрычніку сенатары будуць працаваць ва ўсіх раёнах Магілёўскай вобласці. Адзіны дзень прыёму пройдзе ў чацвер, 24 кастрычніка.
Папярэдні запіс ажыццяўляецца 22 і 23 кастрычніка з 9.00 да 17.00.

Прыёмы правядуць:

● намеснік Старшыні Савета Рэспублікі **ХАМЕНКА Сяргей Мікалаевіч** — з 11.00 **у Асіповіцкім райвыканкаме** (тэлефоны для запісу: 8 017 327 24 09, 8 02235 6 60 08);

● старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні **ЗАЯЦ Леанід Канстанцінавіч** — з 11.00 **у Бялыніцкім райвыканкаме** (тэлефоны для запісу: 8 029 120 04 47, 8 02232 7 97 41);

● старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве **РУСЫ Міхаіл Іванавіч** — з 11.00 **у Дрыбінскім райвыканкаме** (тэлефоны для запісу: 8 017 222 32 07, 8 02248 7 97 24);

● старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці **СІВЕЦ Сяргей Міхайлавіч** — з 11.00 **у Шклоўскім райвыканкаме** (тэлефоны для запісу: 8 017 327 24 18, 8 02239 7 82 07);

● старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах **ТАТАРЫНОВІЧ Уладзіслаў Вікенцьевіч** — з 11.00 **у Горацкім райвыканкаме** (тэлефоны для запісу: 8 017 327 25 27, 8 02233 7 64 54, 8 02233 7 64 26).

● намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні **БАГЕЛЬ Аляксандр Іванавіч** — з 11.00 **у Быхаўскім райвыканкаме** (тэлефоны для запісу: 8 02237 7 06 36, 8 02231 7 96 40);

● намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве **ВАСІЛЬЕЎ Аляксей Аляксандравіч** — з 11.00 **у Клічаўскім райвыканкаме** (тэлефоны для запісу: 8 017 258 32 99, 8 02236 7 92 95);

● намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы **ГАЙДУКЕВІЧ Валерый Уладзіміравіч** — з 11.00 **у Круглянскім райвыканкаме** (тэлефоны для запісу: 8 017 259 40 00, 8 02234 7 95 93, 8 02234 7 97 00);

● член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы **ГАРОШКІН Аляксандр Рыгоравіч** — з 11.00 **у Клімавіцкім райвыканкаме** (тэлефоны для запісу: 8 029 120 91 11, 8 02244 7 80 40, 8 02244 7 80 03);

● намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы **ЖУК Дзмітрый Аляксандравіч** — з 11.00 **у Чавускім райвыканкаме** (тэлефоны для запісу: 8 017 311 03 45, 8 02242 7 89 87);

● член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы **ЛУК'ЯНАЎ Аляксандр Сяргеевіч** — з 10.00 **у Палыкавіцкім сельскім выканкаме Магілёўскага раёна** (тэлефон для запісу: 8 0222 76 70 49, 8 0222 73 20 68);

● член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве **ПЕТРУСЕВІЧ Ірына Іванаўна** — з 11.00 **у Хоцімскім райвыканкаме** (тэлефоны для запісу: 8 0222 63 71 07, 8 02247 7 92 84);

● член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве **САПЕГА Людміла Анатольеўна** — з 11.00 **у Слаўгарадскім райвыканкаме** (тэлефоны для запісу: 8 0232 22 41 24, 8 02246 7 96 85);

● член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве **СЯРГЕЕЎ Ігар Алегавіч** — з 10.00 **у Касцюковіцкім райвыканкаме** (тэлефоны для запісу: 8 02245 7 26 50; 8 02245 5 16 56, 8 02245 7 81 27);

● член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах **СІДАРАЎ Андрэй Аляксандравіч** — з 11.00 **у Краснапольскім райвыканкаме** (тэлефон для запісу: 8 0212 66 60 02);

● член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы **СІРОЦІН Канстанцін Мікалаевіч** — з 11.00 **у Крычаўскім райвыканкаме** (тэлефоны для запісу: 8 0222 74 60 02, 8 02241 2 66 11, 8 02241 2 66 38);

● член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы **СМАЛЯК Ала Віктараўна** — з 11.00 **у Чэрыкаўскім райвыканкаме** (тэлефоны для запісу: 8 0232 56 81 84, 8 02243 7 92 80, 8 02243 7 93 76);

● член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні **ЦІХАМІРАЎ Барыс Барысавіч** — з 11.00 **у Мсціслаўскім райвыканкаме** (тэлефоны для запісу: 8 029 695 13 92, 8 02240 5 90 07);

● член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве **ТАЛКАЧОВА Іна Уладзіміраўна** — з 10.00 **у Глускім райвыканкаме** (тэлефоны для запісу: 8 01742 3 73 46, 8 02230 7 89 80, 8 02230 7 89 71).

● 25 кастрычніка 2024 г. з 11.00 намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах **АНАНІЧ Віктар Міхайлавіч** правядзе прыём грамадзян **у Кіраўскім райвыканкаме** (тэлефоны для запісу: 8 017 309 08 06, 8 02237 7 91 62).

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуюць у сувязі са смерцю былога генеральнага дырэктара РУП «Нацыянальны аэрапорт Мінск» Вячаслава Васільевіча ХАРАНЕКІ і выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.

«ЗБІРАЙЦЕ І ЗАХОЎВАЙЦЕ ДЛЯ ГІСТОРЫІ...»

80 гадоў таму Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ўпершыню адчыніў свае дзверы для наведвальнікаў

Гэта адзіны музей краіны, створаны ў складаны час ваеннага ліхалецця. Унікальнасць музея таксама ў тым, што на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў пасля вайны ён заставаўся найбуйнейшай установай такога профілю на тэрыторыі Савецкага Саюза. Значна пазней музеі па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны былі адкрыты спачатку ў Кіеве, а потым і ў Маскве на Паклоннай гары.

Пачаткам збору матэрыялаў для будучага музея ў Мінску стала рашэнне ЦК КП(б)Беларусі ад 2 чэрвеня 1942 года аб стварэнні рэспубліканскай камісіі па зборы дакументаў і матэрыялаў Айчыннай вайны. Узначаліў камісію сакратар ЦК КП(б)Б па прапагандзе Цімафей Гарбуноў. У яе склад увайшлі гісторык Іван Краўчанка, намеснік начальніка Беларускага штаба партызанскага руху Іван Крупеня, пісьменнік Міхась Лынькоў, сакратар ЦК КП(б)Б Уладзімір Малін, сакратар ЦК ЛКСМБ Сяргей Прытыцкі, начальнік упраўлення культ-асветустаноў СНК БССР Еўдакія Уралава. Непасрэдную работу па зборы матэрыялаў вялі навуковыя супрацоўнікі пад кіраўніцтвам адказнага сакратара камісіі Васіля Стальнова, у далейшым першага дырэктара музея гісторыі Айчыннай вайны.

Малюнк Л. Бойкі.

Афіцыйнай датай заснавання музея лічыцца 30 верасня 1943 года, калі была прынята пастанова «Аб стварэнні музея па гісторыі барацьбы беларускага народа з нямецка-фашысцкімі акупантамі ў Вялікую Айчынную вайну». Адначасова ва ўсе партызанскія брыгады і асобныя атрады Беларускі штаб партызанскага руху накіраваў радыёграму: «Усе прадметы, дакументы, сцягі, якія сведчаць аб гераізме атрадаў, асобных партызан, а таксама матэрыялы аб зверствах нямецкіх акупантаў захоўвайце і пры першай магчымасці дастаўляйце за лінію фронту з дадаваннем кароткага апісання аб накіраваных дакументах».

Выканаўца абавязкаў камандзіра Палескага партызанскага злучэння Іван Скалабан у дырэктыве партызанскім брыгадам вобласці пісаў: «У мэтах захавання для гісторыі дакументальныя і рэчавыя матэрыялы, якія адлюстроўваюць развіццё партызанскага руху ў Беларусі, збірайце і перасылайце ў штаб злучэння. Пры немагчымасці адпраўкі захоўвайце іх на месцы, закопвайце названы матэрыял у тайных месцах для далейшай выемкі пасля вызвалення раёна ад акупантаў». На жаль, праз некалькі дзён пасля падпісання гэтага гістарычнага дакумента Іван Васільевіч Скалабан па-геройску загінуў.

Першыя дакументы і прававраз музея

Галоўнай крыніцай паступлення матэрыялаў у камісію былі камандзіроўкі яе супрацоўнікаў у воінскія часці, партызанскія фарміраванні, на эвакуіраваныя ў савецкі тыл беларускія прадпрыемствы. Першымі дакументамі, якія паступілі ў камісію, былі запісаныя аповеды арганізатараў партызанскага руху і патрыятычнага падполля, вялікая колькасць падпольных лістовак, газет, фотаздымкаў, актаў аб злачынствах фашыстаў у Беларусі і г. д.

Вынікі дзейнасці камісіі на працягу шасці месяцаў упершыню знайшлі адлюстраванне на выстаўцы «Беларусь жыве, Беларусь змагаецца», якая адкрылася ў першых чыслах лістапада 1942 года ў Маскве ў памяшканні Дзяржаўнага гістарычнага музея на Краснай плошчы. У гэты час нямецкія войскі стаялі каля сцен Сталінграда, а ў сталіцы СССР адкрылася экспазіцыя аб барацьбе беларускага народа ў тыле ворага. Менавіта гэта выстаўка і стала прававобразам музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Мяшок нямецкіх узнагарод і партызанскія малюнкі

Пасля дырэктыўных указанняў ЦК КП(б)Б і партызанскага камандавання ў БШПР, у камісію па гісторыі Айчыннай вайны ад падпольных райкамаў партыі, камандзіраў брыгад і атрадаў, асобных партызан пачалі паступаць дакументальныя і рэчавыя сведчанні гераічнай барацьбы беларускага народа з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У прыватнасці, 16 снежня 1942 года першы сакратар ЦК ЛКСМБ Міхаіл Зімянін у запісцы камісіі па гісторыі Айчыннай вайны пісаў: «Прашу прыняць ад мяне трафейны нямецкі аўтамат Героя Савецкага Саюза таварыша Казлова — яго падарунак».

5 жніўня 1943 года камандаванне партызанскага атрада імя К. Я. Варашылава Мінскай вобласці перадало ў камісію сцяг артылерыйскага палка 8-й стралковай дывізіі. На суправаджальным пісьме старшыні камісіі сакратара ЦК КП(б)Б Ц. С. Гарбунова, адрасаваная сакратару камісіі Стальнову: «Пакладзіце гэты сцяг у чамадан і захоўвайце. Зрабіце апісанне з пазнакай, адкуль атрымана і пры якіх абставінах». Выратаваны сцяг палка і сёння экспануецца ў музеі.

З партызанскай брыгады «Буравеснік», якая дзейнічала ў Рудзенскім і Пухавіцкім раёнах, 1 верасня 1943 года ў Маскву быў дастаўлены нямецкі трафейны аўтамат, што належаў мінскаму ваеннаму камісару Эрэнгейтэру, забітаму партызанамі 10 чэрвеня 1943-га пры правядзенні баявой аперацыі па разгроме варожай аўтакалоны на шашы Мінск — Слуцк у раёне вёскі Валяр'яны. Тады ж былі захоплены і іншыя трафеі. Сярод іх аказаўся мяшок нямецкіх узнагарод, які таксама быў дастаўлены ў Маскву і ў далейшым стаў набыткам музея.

На месяц раней партызан брыгады «Разгром» Мінскай вобласці прафесійны мастак Леанід Бойка накіраваў у камісію пасылку з малюнкамі, напісанымі ім у тыле ворага. У суправаджальным пісьме ён паведамляў: «Нягледзячы на цяжкія ўмовы, усе замалёўкі і партрэты зроблены з натуры, праўдзіва і дакладна перадаюць асобныя моманты з нашага партызанскага жыцця. Некаторыя малюнкі, на ваша меркаванне, могуць быць выкарыстаны ў друку «Советской Белоруссии», «Комсомольской правды» або ў часопісах, а таксама ў аддзеле партызанскага руху музея Айчыннай вайны».

У Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь захоўваецца і другое пісьмо Бойкі, дзе ён паведамляў аб перасылцы яшчэ дзесяці малюнкаў, якія просіць перадаць у музей. У канцы пісьма мастак-партызан абяцае: «У далейшым, калі будзе магчымасць, я дашлю вам яшчэ малюнкі аб партызанскім быце, баявых эпізодах, а таксама замалёўкі вынікаў устанаўлення «новага парадку» нямецкімі акупантамі». Сёння ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны захоўваецца і экспануецца 58 малюнкаў, партрэтаў байцоў і камандзіраў, выкананых алоўкам мастаком-партызанам Леанідам Бойкам.

Каштоўныя паступленні і свая падсобная гаспадарка

Тым часам Чырвоная Армія вяла наступальныя аперацыі, вызваляючы Беларусь ад акупантаў. У пачатку чэрвеня 1944 года калектыў музея разам з камісіяй па гісторыі Айчыннай вайны ў спецыяльным вагоне прыбыў з Масквы ў Гомель, а 29 ліпеня накіраваўся ў вызвалены Мінск, дзе размясціўся ў будынку Дома працы на плошчы Свабоды. З 1 жніўня 1944-га заступіў на пасаду дырэктара музея Васіль Дзям'янавіч Стальноў.

Трэба аддаць належнае супрацоўнікам музея, якія стаялі каля вытокаў яго стварэння. Куды толькі не звярталіся яны ў пошуках музейных прадметаў. Гэта і воінскія часці, і выдавецтвы, райвыканкамы, камітэты ўнутраных спраў і дзяржаўнай бяспекі і г. д. У архіве захоўваецца пісьмо музея да камандзіра трафейнага батальёна (і такі быў), у якім выказвалася просьба аб выдачы музею авіябомб «у колькасці да 20 штук».

Пасля злучэння партызан з Чырвонай Арміяй асноўнай крыніцай паступлення экспанатаў для будучай экспазіцыі музея стаў Беларускі штаб партызанскага руху (БШПР),

Будынак музея на плошчы Свабоды, 1944 год.

які да таго часу перамясціўся з Гомеля на ўскраіну Мінска, у вёску Лошыца. У пачатку верасня 1944 года з БШПР музеем атрымана 22 адзінкі самаробнай зброі, 34 сцягі партызанскіх брыгад і атрадаў, 16 рукапісных часопісаў, вялікая колькасць баявых лісткоў і сценгазет, 80 пячатак і штампаў партызанскіх фарміраванняў. У кастрычніку 1944-га з Беларускага штаба партызанскага руху паступіла яшчэ 50 музейных прадметаў, так ці інакш звязаных з партызанскім рухам. Сярод іх — біноклі, друкаваныя выданні акупацыйных улад, партызанскія друкарні, стралковая зброя, шапкі партызанскія, валёнкі, рамяні, іншае абмундзіраванне партызан.

Першы штатны расклад музея ўтрымліваў 245 чалавек. Толькі экспазіцыйных аддзелаў налічвалася сем. Акрамя іх былі арганізаваны экскурсійна-лекцыйны, фондавы, рэдакцыйна-выдавецкі, планава-фінансавы, гаспадарчы, мастацкі аддзелы; фотастудыя, бібліятэка, сакрэтная частка. У музеі працавала сталовая, сталярная і слясарная майстэрні, была ваенізаваная ахова.

У першыя пасляваенныя гады музей валодаў падсобнай гаспадаркай у раёне Уручча, называлася яна «Хутар Белы лес». Для супрацоўнікаў гаспадарка была падмогай для забеспячэння сем'яў збожжам, агародніна. У штаце былі два конюхі і свінарка, а значыць, мелася і невялікая ферма.

Першыя выстаўкі і клопат аб помніках

Для кіраўніцтва мастацкімі работамі пры афармленні экспазіцыі і напісанні партрэтаў у музеі быў сфарміраваны Мастацкі савет, у склад якога ўвайшлі вядомыя беларускія мастакі З. Азгур, Я. Зайцаў, І. Ахрэмчык, А. Кроль. У мастацкім аддзеле музея ў першыя гады працавала восем мастакоў.

Хутка падрыхтаваць стацыянарную экспазіцыю не ўяўлялася магчымым, таму ЦК КП(б)Б паставіў перад музеем задачу стварыць дзве выстаўкі: «Узбраенне беларускіх партызан» і «Бальшавіцкі друк у дні Вялікай Айчыннай вайны». Да кастрычніка 1944 года калектыў музея з гэтай задачай справіўся. Вось як пра гэта гаварылася ў загадзе па музеі: «Сёння, 22 кастрычніка 1944 года, першыя дзве выстаўкі адкрытыя для агульнага агляду наведвальнікаў штодзень з 12 да 4 гадзін дня (акрамя панядзелка). Дзень адкрыцця выставак лічыць днём адкрыцця Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны».

Праз паўгода ў музеі на плошчы Свабоды, 2 былі адкрыты яшчэ дзве выстаўкі «Зверствы нямецкіх захопнікаў у Беларусі», «Вызваленне і аднаўленне Мінска».

Ужо ў той час музей праяўляў клопат аб захаванні памятных месцаў, звязаных са знішчэннем фашыстамі савецкіх грамадзян, баявымі дзеяннямі партызан і Чырвонай Арміі. Так, 13 снежня 1944 года ў пісьме Народнаму камісарыяту лясной гаспадаркі БССР музей просіць аб неадкладным спыненні высечкі лесу каля вёскі Малы Трасцянец, разборкі печаў і пабудоў — гістарычных помнікаў, якія сведчылі аб зверствах фашыстаў у лагеры смерці, што тут знаходзіўся.

Захаваўся дакумент (без даты) «Настаўленне ахоўніку адкрытай выстаўкі «Поле бою пад Мінскам. Урочышча каля вёскі Абчак», падпісаны дырэктарам Стальновым. Прыводзім яго змест: «Дырэкцыя Белдзяржмузея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны даводзіць да вашага ведама, што ўся наяўная на полі і ў лесе трафейная маёмасць: гарматы, рэшткі ад машын, танкі, снарады, разбітыя самалёты, масты, драўніна і жалеза ад нямецкіх умацаванняў і да т. п., належыць музею і што ўсе арганізацыі і грамадзяне, якія будуць замахвацца на музейныя каштоўнасці, будуць прыцягвацца да судовай адказнасці. Калі факты замаху будуць выяўлены, неадкладна аб гэтым паведамляць дырэкцыі музея».

З мэтай збору матэрыялаў аб гераізме і мужнасці савецкіх воінаў падчас вызвалення Беларусі музей у канцы 1944-га — пачатку 1945 года арганізаваў тры экспедыцыі на 1-ы, 2-і і 3-і Беларускія франты. Сярод камандзіраваных былі Пётр Лавецкі і Вера Раманоўская, былыя партызаны, якія ўсё жыццё і працоўную дзейнасць прысвяцілі музею. Аўтару гэтых радкоў пашчасціла ў 1970—1980-я гады працаваць разам з імі і на ўсё жыццё захаваць удзячную памяць пра гэтых цудоўных людзей, іх унёсак у стварэнне і развіццё музея. Дзякуючы дапамозе камандавання франтоў, у музей паступілі не толькі фотаздымкі, дакументы, рэчавыя музейныя прадметы, але і такія неабходныя ў той час абсталяванне і матэрыялы, мэбля, друкарскія машынкі, палатно для мастакоў, канцылярскія тавары, дыванкі і іншае.

Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны быў і застаецца флагманам патрыятычнага выхавання, прапаганды вялікага подзвігу савецкага народа ў барацьбе з фашызмам, заслуг беларускага народа ў партызанскай барацьбе, выкрыцця нацысцкай палітыкі гітлераўскай Германіі. Наколькі гэта актуальна ў цяперашні час, гаварыць не прыходзіцца.

Генадзь БАРКУН.
Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА і з архіва Белдзяржмузея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Нашы каштоўнасці

У ГОНАР ШМАТДЗЕТНЫХ

Музей маці і сям'і ўрачыста адкрылі ў Століне

Вельмі прыгожа і сімвалічна завяршылі Тыдзень бацькоўскай любові ў Століне. Музей маці і сям'і проста мусіў быць тут, на Століншчыне, у раёне, дзе пражывае 2332 шматдзетныя сям'і, а 837 жанчын маюць ордэн Маці. Дарэчы, згаданая ўзнагарода пад нумарам 00001 таксама ў свой час заззяла на грудзях жыхаркі Столінскага раёна.

Вядома ж, галоўнымі гераінямі цырымоніі адкрыцця сталі жанчыны з ордэнамі — найвышэйшай адзнакай мацярынскай доблесці. Іх прыйшло шмат у музей, які размясціўся ў самым цэнтры Століна, у гістарычным будынку. Рэалізацыя праекта стала магчымай дзякуючы ўдзелу многіх людзей і ўстаноў, у тым ліку спонсараў, адным з якіх стаў Нацыянальны банк. Экспазіцыя знаёміць з гісторыяй і традыцыямі палескага краю ў кантэксце сям'і. Тут прадстаўлены, напрыклад, вясельны абрад, святкаванне нараджэння дзіцяці, ёсць матэрыялы па выхаванні дзяцей, побыце сям'і. Вядома, асаблівае месца займаюць раздзелы пра шматдзетных маці раёна, пра сем'і, у якіх выхоўваецца многа дзяцей.

Яшчэ ў маі гэтага года **старшыня Столінскага райвыканкама Рыгор ПРАТАСАВІЦКІ** ў інтэрв'ю нашай газеце захоплена расказваў пра сям'ю Бруцкіх з вёскі Белавуша. Яе галава — 84-гадовы Андрэй Данілавіч Бруцкі разам з жонкай выхаваў дзевяць сыноў і шэсць дачок. Зараз у яго ўжо 92 унукі! І вось што цікава. Падчас інтэрв'ю кіраўнік раёна, які за некалькі дзён да таго наведаў сям'ю, сказаў аўтару гэтых радкоў пра 27 праўнукаў Андрэя Бруцкага, а на адкрыцці музея агучылі лічбу 31. Значыць, расце сям'я, нараджаюцца новыя дзеці. І на цырымоніі адкрыцця старэйшына сям'і з уласцівай яму сціпласцю гаварыў аб тым, што стараўся выхоўваць дзяцей па біблейскіх запаветах, прывучаў да працы і да звычкі разлічваць на свае сілы. Сам ён быў прыкладам для дзяцей, дом пабудаваў уласнымі рукамі, а калі сям'я разрасталася, дабудоўваў. «Раней дапамогі на дзяцей не плацілі. Усё самі зарабялі», — згадаў пенсіянер. А пра Бруцкіх сказалі, што другой такой сям'і няма ў краіне, дзе адразу б захоўвалася 11 ордэнаў Маці: жонка Андрэя Данілавіча, пяць яго дачок і пяць нявестак удастоены высокай узнагароды.

— Менавіта ў яго дома за няспешнай гутаркай станавілася зразумела, што ў чалавека, які мае такую колькасць дзяцей, у сэрцы не застаецца месца для дрэннага, — гаварыў Рыгор Пратасавіцкі. — У іх доме пануе дабрыня, спагада, хоць усяго было за доўгае жыццё гаспадара. Ён, напрыклад, згадваў, як далёка не ўсе разумелі іх з жонкай жаданне мець вялікую сям'ю. Быў час, калі, згодна з пастановай ЦК кампартыі, змагаліся з так званымі непрацоўнымі даходамі. Тады было дазволена мець цяпліцу плошчай не больш за адну сотку і не вышэй за 75 сантыметраў, інакш яе зраналі бензапілой. Так здарылася і на падворку шматдзетнага бацькі: дзеці стаяць, глядзяць, а іх, нібы якіх кулакоў, пазбаўляюць маёмасці... Але ж усё перажылі і захавалі працавітасць, дабрыню да людзей. Узаемаадносіны з такімі шаноўнымі грамадзянамі, як Андрэй Бруцкі, зараджаюць энергіяй, — падсумаваў кіраўнік раёна.

І расказаў, як годам раней, у Дзень сям'і, на галоўнай плошчы Століна сабралі трыста матуль з ордэнамі Маці. Паставілі крэслы ў некалькі радоў: сядзелі жанчыны з самай пачэснай узнагародай. Можна сабе ўявіць, якое гэта было відовішча! Казалі, што ад такой прыгажосці слёзы наварочваліся... Атрымалася не проста мерапрыемства з нагоды свята — урачыстасць у гонар шматдзетнасці, у гонар маці, якія прысвяцілі сябе служэнню сям'і. Вось так і нарадзілася ідэя стварыць музей.

...У сённяшняй экспазіцыі знайшлося месца гераічным і трагічным старонкам гісторыі краю. Ёсць матэрыялы, якія ўслаўляюць жанчын-працаўніц, жанчын-лідараў, ну і, вядома, шматдзетных маці. Цікавымі экспанатамі можна назваць дакументы аб нараджэнні дзяцей розных эпох: прадстаўлены царкоўная кніга з запісамі аб нараджэнні немаўлят, пасведчанні аб нараджэнні савецкага перыяду і сучаснага ўзору, ёсць і вядомая ўсім мамам бірка з радзільнага дома. Унікальным экспанатам варта лічыць згаданае пасведчанне і саму ўзнагароду жыхаркі раёна Марыі Азімка, якая першай у Беларусі стала ўладальніцай ордэна Маці.

Стваральніца музея і яго захавальніца, загадчыца раённага вучэбна-метадычнага кабінета Валянціна Грэчка паведаміла аб задумках папоўніць экспазіцыю матэрыяламі аб жанчынах, якія ваявалі на фронце, у партызанскіх атрадах, працавалі ў тыле. Гэта работа будзе праведзена да 80-годдзя Перамогі. А пазней музей зоймецца даследчай работай пра маці, чые дзеці дабіліся вялікіх поспехаў у жыцці. Століншчына багатая знакамітымі выхадцамі.

Адзін з іх, старшыня праўлення Нацыянальнага банка Павел Калаур, прысутнічаў на цырымоніі адкрыцця. Ён нават перадаў музею падарункі ад сваёй сям'і: абраз Багародзіцы, дзве калекцыйныя манеты, выпушчаныя ў гонар жанчын. Старшыня праўлення Нацбанка падкрэсліў, што шматдзетных маці варта ўслаўляць і дзякаваць ім.

А старшыня Столінскага райвыканкама Рыгор Пратасавіцкі выказаў упэўненасць, што музей паслужыць справе папулярызацыі асноўнай духоўна-маральнай каштоўнасці грамадства — сям'і, што ён падтрымлівае прапанову прадстаўніцтва Беларускага саюза жанчын, іншых грамадскіх арганізацый праводзіць у музеі заняткі для школьнікаў.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота БелТА.

З нагоды

Сям'я — аснова грамадства

Учора ў Беларусі завяршыўся Тыдзень бацькоўскай любові, які стартаваў 14 кастрычніка з Дня маці, а яго фіналам стала новае для беларусаў свята — Дзень бацькі. У медыяцэнтры Віцебскай вобласці абмеркавалі пытанні падтрымкі сем'яў з дзецьмі і папулярызацыі інстытута сям'і падчас круглага стала «Сямейная палітыка і сямейныя каштоўнасці — аснова беларускай дзяржавы».

У Беларусі надаюць вялікую ўвагу абароне і падтрымцы сем'яў з дзецьмі, актыўна развіваецца сістэма сацыяльнай дапамогі. У прыватнасці, сем'ям у сувязі з нараджэннем і выхаваннем дзяцей выплачваецца найбольшая ў параўнанні з суседнімі краінамі колькасць дапамог — 11 відаў.

Самая вялікая сям'я паўночнага рэгіёна пражывае ў абласным цэнтры, у ёй выхоўваюцца трынаццаць дзяцей. Таксама ёсць дзве сям'і з адзінаццаццю дзецьмі, адна — з дзесяццю, тры — з дзевяццю дзецьмі. Каля дзвюх тысяч сем'яў маюць па чатыры дзіцяці. Сем'яў з трыма дзецьмі ў вобласці — 9442. Пры нараджэнні або ўсынаўленні трэцяга або наступных дзяцей сем'ям выдзяляецца сямейны капітал, які на дадзены момант складае 31 480 рублёў.

«Сёлета 800 сем'яў падалі заявы на атрыманне сямейнага капіталу, 785 — датэрмінова яго атрымалі. У большасці выпадкаў гэты від падтрымкі выкарыстоўваецца для паляпшэння жыллёвых умоў, а таксама для атрымання адукацыі, медыцынскіх паслуг. У 2022 годзе пашыраны пералік мэт для атрымання сямейнага капіталу, напрыклад, на набыццё тэхнічных сродкаў сацыяльнай рэабілітацыі людзей з дадатковымі патрэбамі (дзіцяці-інваліда). Сем'ям, у якіх нараджаецца два ці тры дзіцяці адначасова, аказваецца дадатковая матэрыяльная дапамога на набыццё рэчаў першай неабходнасці, на працягу двух гадоў забяспечваецца бясплатнае атрыманне харчавання для дзяцей з сем'яў з нізкімі даходамі. У нашай вобласці дзейнічае аддзяленне рэабілітацыі для дзяцей-інвалідаў, паслугі ў якім аказваюцца на бязвыплатнай аснове. Сёлета 30 сем'яў атрымалі паслугу сацыяльнай перадышкі: напрыклад, сям'я можа бясплатна на 56 дзён адправіць сваё дзіця ў Багушэўскі сацыяльны пансіянат «Прамяністы», дзе аказваецца медыцынская і сацыяльная рэабілітацыя. Для шматдзетных сем'яў, а таксама тых, дзе выхоўваюць дзіця-інваліда, пры ТЦСАН створаны бацькоўскія клубы, дзе пад наглядам супрацоўнікаў можна пакінуць дзяцей, а бацькам у гэты час папрацаваць са спецыялістамі цэнтра», — расказала **намеснік старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Віцебскага аблвыканкама Вера АСТАПЕНКА.**

Як паведаміла **начальнік аддзела выхаваўчай работы галоўнага ўпраўлення па адукацыі аблвыканкама Вольга ДАРОЖКА,** у сістэме адукацыі праводзіцца мэтанакіраваная работа па фарміраванні сапраўдных грамадзян, патрыётаў нашай краіны, выхаваных на духоўна-маральных, сямейных каштоўнасцях. Для шматдзетных сем'яў прадугледжваюцца льготы пры арганізацыі аздараўлення дзяцей у летні перыяд, аплаце за падручнікі і навучальныя дапаможнікі. Дзецям са шматдзетных сем'яў даецца бясплатнае харчаванне ва ўстановах адукацыі. Наладжана супрацоўніцтва з прадстаўнікамі Беларускай праваслаўнай царквы, праводзяцца пасяджэнні дзіцяча-бацькоўскіх клубаў, форумы замяшчальных сем'яў. Бацькоўскі ўніверсітэт — гэта рэспубліканскі праект, мэта якога — пашырыць рамкі супрацоўніцтва сям'і і школы, павысіць педагагічную і псіхалагічную адукаванасць дарослых, фарміраваць навыкі адказнага бацькоўства. Праект рэалізоўваецца ў кожнай школе і гімназіі, на Віцебшчыне ў рамках яго штогод праходзіць каля 20 тысяч мерапрыемстваў. Больш за пяць тысяч дзяцей наведваюць у школах факультатывы духоўна-маральнай і сямейнай тэматыкі. Новай формай работы бацькоўскіх універсітэтаў стала практыка наведвання педагогамі працоўных калектываў для абмеркавання з бацькамі актуальных пытанняў, такіх як бяспечныя прагулкі, прафілактыка злачынстваў і правапарушэнняў, у летні час педагогі наведалі каля 400 буйных арганізацый і правялі гутаркі з 13 тысячамі бацькоў. У Наваполацку праводзяцца гарадскія канферэнцыі бацькоў па актуальных пытаннях, майстар-класы для дзяцей ад бацькоў, у Віцебску функцыянуе школа актыўнага бацькоўства.

Мноства цікавых праектаў, накіраваных на падтрымку маці, дзяцей і ў цэлым сямейных каштоўнасцяў, рэалізоўвае Беларускі саюз жанчын. Па ініцыятыве Віцебскай гарадской арганізацыі пры падтрымцы ВДУ імя П. Машэрава створаны ўнікальны віртуальны музей маці, дзе можна даведацца пра жанчын, узнагароджаных ордэнам Маці, прэміяй імя Зінаіды Тусналобавай-Марчанка, удастоеных ганаровага звання «Жанчына года Беларусі». «Здабыткам краіны сталі акцыі, ініцыіраваныя БСЖ, «Збяром партфель разам», «Нашы дзеці». Жаночы савет актыўна супрацоўнічае з таварыствам інвалідаў і аказвае пасільную дапамогу дзецям-інвалідам, падтрымлівае адзінокіх бацькоў, якія выхоўваюць дзяцей. У рамках праекта «Жаночае сэрца Беларусі» сумесна з прадстаўнікамі ўстаноў аховы здароўя актывісты БСЖ праводзяць мерапрыемствы па прафілактыцы розных захворванняў, абортаў», — адзначыла **старшыня праўлення Віцебскай гарадской арганізацыі БСЖ Наталля КУЛЬЦЕНКА.**

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У Празе забаранілі начныя экскурсіі для турыстаў па пабах

Улады сталіцы Чэхіі забаранілі начныя экскурсіі па пабах, арганізаваныя турагенцтвамі, каб прывабіць у горад больш культурных турыстаў, паведамляе брытанская газета The Guardian. «Чэшская сталіца, насельніцтва якой складае 1,3 мільёна чалавек, ужо даўно з'яўляецца папулярным месцам для ўдзельнікаў шумных хлапечнікаў і аматараў пабаў, у асноўным з Вялікабрытаніі. Намеснік мэра Прагі Здэнэк Гржыб паведаміў журналістам, што арганізаваныя начныя паходы па пабах будуць забаронены», — адзначае выданне. Як заявілі ў мэрыі, горад хоча прыцягваць «больш культурных і заможных турыстаў, а не тых, якія прыязджаюць на кароткі тэрмін, каб напіцца». Кіраўнік Чэшскай асацыяцыі гатэляў і рэстаранаў Вацлаў Старак вітаў рашэнне мэрыі: «Паездкі ў цэнтр чэшскай сталіцы ў пошуках піва сталі праблемай для мясцовых жыхароў ды іншых турыстаў. Нікому не забароняць хадзіць у паб, але арганізаваныя паходы штовечар нам не патрэбны».

Другі тур прэзідэнцкіх выбараў у Малдове пройдзе 3 лістапада

Галасаванне на прэзідэнцкіх выбарах у Малдове прайшло 20 кастрычніка. Ніводзін з 11 кандыдатаў не набраў хаця б паловы галасоў, таму будзе прызначаны другі тур галасавання. Ён адбудзецца 3 лістапада. Аб гэтым заявіла старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Анжаліка Караман, паведаміла ТАСС. Дзейны прэзідэнт Малдовы Мая Санду атрымала на выбарах каля 42 працэнтаў галасоў, экс-генпракурор Аляксандр Стаяногла, які крытыкуе Санду за палітыку канфрантацыі з Масквой, — звыш 26 працэнтаў. На рэферэндуме аб уступленні ў Еўрапейскі саюз за еўраінтэграцыю прагаласавала крыху больш за 50 працэнтаў грамадзян краіны, супраць выступілі звыш 49 працэнтаў выбаршчыкаў, сведчаць папярэднія звесткі Цэнтральнай выбарчай камісіі. Пры гэтым толькі чвэрць адмістрацыйных адзінак Малдовы на рэферэндуме аб ЕС выказаліся за змену канстытуцыі краіны дзеля еўраінтэграцыі — гэтае рашэнне падтрымалі толькі дзевяць раёнаў з 36.

ЖЫВОЕ АСЯРОДДЗЕ СЯРОД ШКЛА І БЕТОНУ

Як Гродна вяртае славу зялёнага горада

Яшчэ не так даўно ішла гаворка аб тым, каб да 2030 года азеляніць абласны цэнтр на 40 працэнтаў. Сёння спецыялісты аховы прыроды канстатуюць, што гэта лічба нават большая. Але ці аптымальная яна для гарадскога асяроддзя? Што робіцца для таго, каб статус зялёнага горада стаў яшчэ адным брэндам абласнога цэнтра? Прадстаўнікі адпаведных ведамстваў праяснілі сітуацыю.

Як вядома, дрэвы ў горадзе — не проста атрыбут навакольнага асяроддзя. Гэта жывыя арганізмы, якія ратуюць жыхароў ад уплыву забруджанага паветра, тым самым ствараюць камфорт.

Галоўны вораг чыстага паветра — гарадскі аўтатранспарт. Ад яго ўтвараецца 80 % шкодных выкідаў, і з гэтым прыходзіцца змагацца дрэвам. Яны дыхаюць, у іх інтэнсіўны газаабмен і фотасінтэз, а лісты дазваляюць лавіць пыл. Такім чынам дрэвы зніжаюць утрыманне шкодных для чалавека рэчываў ад 25 да 90 %.

Разам з тым дрэвы павялічваюць вільгаць паветра, таму што ў гарадах яно сухое, што не спрыяе здароўю. Горад — гэта ў экалагічным сэнсе тая ж пустыня: асфальт, плітка, бетонныя сцены пад сонцам хутка награваюцца, ноччу адбываецца высокі перапад тэмператур. Дрэвы зніжаюць такія перапады. Гэта сапраўды прыродныя кандыцыянеры, якія ахалоджваюць паветра. Акрамя таго, яны вельмі ўдала ўпісваюцца ў гарадскую архітэктуру, робяць прастору жывой і прывабнай.

Многія старажылы горада над Нёманам памятаюць, якім цяністым было места гадоў 30—40 таму, а ўздоўж вуліц цягнуліся алеі старых дрэў з высокімі кронамі. Сёння карціна іншая. Высокія дрэвы саступілі месца маладым насаджэнням, значна больш з'явілася дэкаратыўных раслін і кустоў, кветкавых інсталяцый, жывых агароджаў і іншых арыгінальных «канструкцый». Вядома, усё гэта радуе вока, але наўрад ці заменіць звыклыя нам каштаны, рабіны і ліпы.

Як патлумачыў **намеснік старшыні Гродзенскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Аляксандр АДАМЕНКА,** у горадзе працэс азеляннення вядзецца няспынна. Работа ідзе ў адпаведнасці з генеральным планам горада і дзяржаўнай праграмай «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе». Асаблівая ўвага — новым маладым мікрараёнам і аб'язным дарогам. На сёння плошча азелянення адпавядае пастаўленым планам і дасягае 42 працэнтаў.

— Летась у Гродне было пасаджана звыш 65 тысяч дрэў і кустоў, сёння гэта лічба складае каля 30 тысяч, асноўныя пасадкі пачаліся на гэтым тыдні і будуць працягвацца да канца месяца. Запланаваны вялікія акцыі ў Гродне і ў райцэнтрах. У іх могуць прыняць удзел усе, хто жадае. Апошнім часам усё больш людзей далучаецца. Мы дасягнулі таго ўзроўню азелянення, якое ўстаноўлена заканадаўствам, але спыняцца не варта, бо дрэвам патрэбна замена. Таму на кожны год закладваюцца вялікія аб'ёмы, каб азеляніць не толькі населеныя пункты, але і дарогі, тэрыторыі агульнага карыстання, — расказаў эколаг і падкрэсліў, што дрэвы саджаюць усюды, дзе ёсць такая магчымасць.

Асноўны прынцып азеляненя — замест аднаго выдаленага дрэва пасадзіць некалькі: як правіла, не менш за тры. Такая сітуацыя назіраецца ва ўсім горадзе, дзе заўважна паменшылася колькасць старых дрэў. У першую чаргу, гэта звязана з рэканструкцыяй дамоў і вуліц. Але не толькі. Значную частку старых дрэў ліквідавалі з-за іх аварыйнага стану, перашкод у асвятленні дамоў, эксплуатацыі інжынерных сетак. Улічваюцца і наступствы стыхіі. Сёлета, напрыклад, у выніку ўрагану старая вярба ўпала на гандлёвы павільён у Гродне. У мерах перасцярогі было ліквідавана яшчэ некалькі аналагічных дрэў. Пад высечку, як правіла, трапляюць небяспечныя дрэвы ці тыя, якія ствараюць перашкоду пры гаспадарчай дзейнасці, а таксама пры рэканструкцыі ці будаўніцтве аб'ектаў. Спецыялісты звяртаюць увагу, што кожны такі выпадак павінен быць абгрунтаваны і весціся ў адпаведнасці з заканадаўствам.

Здараюцца і самавольныя высечкі. Напрыклад, летась выяўлена звыш 40 такіх парушэнняў. Як паведаміў начальнік аднаго з аддзелаў прыродаахоўнага ведамства Дзмітрый Лебедзеў, па ўсіх фактах прыняты меры з кампенсацыяй шкоды, якая нанесена навакольнаму асяроддзю. Гэта сума склала звыш 40 тысяч рублёў. Прыняты меры адміністрацыйнага ўздзеяння ў выглядзе пратаколаў і штрафаў. Эколагі акцэнтуюць увагу на наступствах такіх высечак.

— Калі ў горадзе выдаліць тры дрэвы, то можна трапіць пад крымінальную адказнасць за кошт велічыні страты. Каб да гэтага не даходзіла, кожная высечка павінна адбывацца ў строгай адпаведнасці з заканадаўствам. Для крымінальнай справы дастаткова, каб сума страты дасягала 200 базавых велічынь. Гэта можа быць літаральна некалькі дрэў, бо такса за адно дрэва дасягае 30 базавых велічынь. Летась было некалькі крымінальных спраў, звязаных з высечкай пры вядзенні будаўніцтва. Акрамя штрафу, парушальнік абавязаны ўзнавіць страту за кошт новых пасадак, — патлумачыў Дзмітрый Лебедзеў.

Азеляніць свае двары могуць і самі жыхары. У камітэт прыродных рэсурсаў паступае нямала зваротаў ад гараджан, якія хочуць пасадзіць дрэвы і кусты каля сваіх дамоў. Аднак без дазволу гэтага рабіць нельга. Усе пасадкі трэба ўзгадняць з мясцовымі органамі ўлады, інакш такія дзеянні будуць расцэньвацца як самазахоп зямлі і правядзенне несанкцыянаваных работ, што вядзе да адміністрацыйнай адказнасці. Каб здзейсніць такую пасадку, найперш трэба звярнуцца з асабістым ці калектыўным пісьмом у ЖЭС ці ў таварыства ўласнікаў дома. Разам з дазволам для пасадкі дрэў будзе прапанавана і месца, якое не парушыць падземныя камунікацыі.

Дарэчы, менавіта яны, інжынерныя камунікацыі, вымушаюць шукаць новыя падыходы ў азеляненні горада. Напрыклад, у цэнтры «вырасла» цэлая алея дрэў у кадках. Па словах майстра па азеляненні прадпрыемства «Гроднаазелянбуд» Надзеі Суравец, дрэвы ў кадках ставяцца там, дзе няма магчымасці пасадзіць іх у зямлю. Асабліва гэта датычыцца цэнтральнай часткі горада, дзе вельмі шмат падземных камунікацый, хоць на першы погляд нямала пустых участкаў. У гэтых выпадках прадугледжваецца дэкаратыўнае азеляненне, кветкавыя і раслінныя інсталяцыі. Сёлета ўпершыню ў Гродне з'явілася 600 метраў кветкавай агароджы, якая ўпрыгожвае цэнтр і Стары мост.

Высаджваюцца і экзатычныя расліны. Летась у парку з'явілася алея сакуры. Не так даўно прадпрыемствам «Гроднаазелянбуд» у Швейцарскай даліне высаджана паўлоўнія, якая цвіце буйнымі блакітна-фіялетавымі суквеццямі. З'явілася метасеквоя, гінкга, расце цюльпанавае дрэва.

Ёсць цікавыя экзэмпляры таксама на Алеі сяброўства, якая высаджваецца падчас фестывалю нацыянальных культур у Каложскім парку. Звыш ста відаў і сартоў раслін можна ўбачыць у дэндрарыі каля Гродзенскага аграрнага ўніверсітэта. Але экзотыка носіць хутчэй эксперыментальны характар.

Што датычыцца масавага азеляненя горада, тут, як правіла, аддаецца перавага мясцовым пародам, такім як клён, бяроза, ліпа, дуб, якія найбольш устойлівыя да шкодных выкідаў і соляў. А вось хвойныя пароды ў горадзе не практыкуюць з-за няўстойлівасці да гарадскога асяроддзя і складанасці догляду.

Таксама абмяжоўваецца і высадка каштанаў, хоць іх нямала ўздоўж гарадскіх дарог. Як зазначыла Надзея Суравец, дрэвы не вельмі добра адчуваюць сябе ў агрэсіўным гарадскім асяроддзі, ужо з сярэдзіны лета ліст пачынае жаўцець і сохнуць. Дарэчы, першыя каштаны ў Беларусі з'явіліся менавіта ў Гродне ў XVIII стагоддзі, калі тут быў закладзены адзін з самых знакамітых батанічных садоў Еўропы. Гарадскі парк цяпер носіць імя яго стваральніка — Жылібера. Нямала старых дрэў тут загінула падчас рэканструкцыі, калі была парушана каранёвая сістэма, сцёк вады, пакрыццё. Тыя, што засталіся, ахоўваюцца і праходзяць санітарную абрэзку. Высаджваюцца ў парку і новыя пароды дрэў.

Увосень мяркуецца высадзіць не менш як 30 тысяч дрэў і кустоў. У вобласці пройдзе вялікая акцыя «Адзіны дзень азеляненя». У ёй могуць прыняць удзел усе, хто пажадае. Асноўная пасадка адбудзецца ў мікрараёне Паўднёвы. Саджанцамі забяспечваюць лясгасы. Азеляненне горада будзе працягвацца ўвесь сезон.

Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.

Надвор'е

РАЗВІТАННЕ З БАБІНЫМ ЛЕТАМ

А з пятніцы нас чакаюць галалёдныя з'явы

На мінулым тыдні трымалася даволі камфортнае, сонечнае надвор'е, якое адпавядала позняму «бабінаму лету». Сённяшні аўторак на гэтым тыдні будзе самым цёплым днём кастрычніка. Пасля ў краіну прыйдуць атмасферныя франты, якія прынясуць невялікія дажджы, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У аўторак пераважна па паўночна-заходняй палове краіны пройдуць невялікія кароткачасовыя дажджы. У начныя і ранішнія гадзіны ў асобных раёнах чакаюцца слабыя туман і галалёд. Тэмпература паветра мінімальная ноччу складзе ад мінус 2 градусаў па паўднёвым усходзе краіны, да плюс 10 градусаў па паўночным захадзе. Здзівіць максімальная тэмпература днём, у сярэднім па краіне яна складзе 10—16 градусаў, а па паўднёвым захадзе краіны павялічыцца да 18 цяпла.

Надвор'е пачне мяняцца ўжо ў сераду. У гэтыя суткі ноччу месцамі, а днём у асобных раёнах па паўночным усходзе краіны прагназуюцца кароткачасовыя дажджы. Ноччу і раніцай месцамі можа быць слабы туман. У дзённыя гадзіны месцамі па поўначы чакаецца ўзмацненне ветру парывамі 15—18 м/с. Тэмпература паветра ўначы апусціцца да нуля градусаў па паўднёвым усходзе і да 8 градусаў па паўночным захадзе краіны, максімальная — 8—15 градусаў.

У чацвер чакаецца чарговая змена надвор'я, калі будзе пераважна без ападкаў, толькі раніцай і днём месцамі па паўночным усходзе краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Ноччу і раніцай у асобных раёнах прагназуюцца слабыя туман і галалёд. Тэмпература паветра ўначы — ад мінус 2 градусаў па поўдні краіны да 6 цяпла па поўначы. Максімальная днём — 7—13 градусаў з плюсам.

У пятніцу месцамі па паўночна-ўсходняй палове краіны пройдуць невялікія дажджы. Ноччу і раніцай у асобных раёнах чакаюцца слабыя туман і галалёд. Тэмпература паветра мінімальная ноччу — 1—8 цяпла, пры праясненнях да мінус 2 градусаў, максімальная днём — 7—14 градусаў.

Згодна з папярэднім прагнозам айчынных сіноптыкаў, у выхадныя захаваецца павышаны фон атмасфернага ціску, таму ападкаў чакаецца менш. Тэмпература ў начныя гадзіны будзе вагацца ад слабага мінуса да слабага плюса. Днём — 8—16 цяпла. Такім чынам, у суботу пераважна без ападкаў, ноччу і раніцай у асобных раёнах чакаюцца слабыя туман і галалёд. Тэмпература паветра ўначы ад мінус 3 градусаў да плюс 3 градусаў, па паўднёвым усходзе да 5 цяпла. Максімальная тэмпература днём складзе 8—15 градусаў.

У апошнюю нядзелю кастрычніка ў асобных раёнах чакаюцца кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай месцамі слабы туман. Тэмпература паветра ўначы — 1—6 цяпла, пры праясненнях да мінус 2 градусаў. Максімальная тэмпература днём падымецца да 9—16 градусаў з плюсам.

Сяргей КУРКАЧ.

ТЫСЯЧЫ ГАРАЧЫХ СЭРЦАЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Незлічоная колькасць відэа- і фотакантэнту...» — гучалі эмацыянальныя водгукі гасцей горада падчас наведвання прадпрыемстваў «Гомсельмаш» і «Камінтэрн». У вытворчых цэхах флагмана лёгкай прамысловасці Гомельшчыны ААТ «Камінтэрн» удзельнікі марафону даведаліся, што за год тут адшываецца больш як 300 тысяч вырабаў. Гасцям выпадала магчымасць пабачыць працэс стварэння касцюмаў з нуля. На прадпрыемстве ААТ «Гомсельмаш» экскурсанты пабачылі не толькі мадэлі камбайнаў, якія выраблялiся амаль паўстагоддзя таму, але і сельгасволаты, што толькі нядаўна сышлі з канвеера.

«Цікава паглядзець знутры на прадпрыемствы Беларусі. Сам працую на вядомым ААТ «Беларускалій». Працую непасрэдна ў шахце. На прадпрыемствах цікава пабачыць усё на свае вочы, а пасля падзяліцца гэтым са сваімі падпісчыкамі, каб разнастаіць іх жыццё, пашырыць кругагляд», — падзяліўся ўражаннямі дабрачынны актывіст, блогер, аматар і папулярызатар спорту і здаровага ладу жыцця з Салігорска Артур Бацькавіч.

«Акцыя — магчымасць завесці знаёмствы, даведацца штосьці новае. Хочацца падзякаваць арганізатарам марафону за магчымасць пабываць у розных гарадах нашай краіны. Асобны дзякуй за тое, што ёсць магчымасць наведваць экскурсіі, пабываць на розных прадпрыемствах», — адзначылі блогер, прадпрымальнік, прадзюсар Максім Бандарчук і яго спадарожніца фітнес-трэнер Анастасія Баравік.

«Марафон адзінства» — гэта цікавае мерапрыемства. А яшчэ марафон — гэта пра патрыятызм. Ён — галоўнае для нашай краіны. Патрыятызм варта прывіваць з малых гадоў, бо калі гэтага не рабіць, я нават не ведаю, што стане з чалавекам. Так, усё пачынаецца з сям'і: любіш родных, любіш тое месца, дзе нарадзіўся і жывеш, шануеш радзіму, імкнешся для яе нешта зрабіць», — перакананы настаўнік фізічнай культуры адной са школ Мінска, блогер Мацвей Швец.

Культурныя месцы прыцягнення

Да ўдзелу ў рэспубліканскай грамадска-культурнай акцыі падключыліся і ўстановы адукацыі і культуры. У Гомельскім дзяржаўным тэхнічным універсітэце імя П. В. Сухога адкрылася выстаўка «Са знакам якасці». Экспазіцыя, прысвечаная Году якасці, — збор унікальных плакатаў з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Прадстаўлены работы савецкіх плакатыстаў 1950—1980-х гадоў. На выставе з гумарам разглядаюцца праблемы якасці працы, сумлення работнікаў, узроўню якасці будаўніцтва, прадукцыі, вытворчасці. Частка выставачных плакатаў аўтарства вядомых мастакоў-графікаў Саюза мастакоў БССР.

У Гомельскім дзяржаўным медуніверсітэце часовую экспазіцыю «Вызваленне

Беларусі. Верасень 1943 года — ліпень 1944-га» прадставіў Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. У аснове выстаўкі — матэрыялы з фондаў, якія адлюстроўваюць храналогію вызвалення Беларусі. У экспазіцыі перададзена тэма ўзаемадзеяння партызан з Чырвонай Арміяй, звесткі аб наступальнай аперацыі «Баграціён». Асобны стэнд экспазіцыі прысвечаны палявой пошце, дзе прадстаўлены лісты савецкіх салдат, якія, на жаль, не дачакаліся Перамогі. Часовую экспазіцыю «Вызваленне Беларусі. Верасень 1943 года — ліпень 1944-га» папоўнілі і супрацоўнікі Гомельскага медуніверсітэта. Так, згаданы гераічныя старонкі жыцця медработнікаў на вайне: успаміны выкладчыкаў ВНУ аб сваіх родных, якія ратавалі параненых на фронце.

У ГДУ імя Ф. Скарыны да «Марафону адзінства» адкрылася выстаўка «Кнігі ў дар Прэзідэнту». Тут можна ўбачыць збор унікальных выданняў, якія ў розныя часы дарылі Аляксандру Лукашэнку лідары краін, грамадскія і культурныя дзеячы. У экспазіцыі сваё месца знайшоў унікальны збор для гісторыкаў, музеолагаў, этнографаў — «Беларускі архіў старажытных грамат», выдадзены ў Маскве ў 1824 годзе. Ён змяшчае 57 дакументаў XVI—XVIII стагоддзяў.

Падарункі да свята

Да «Марафону адзінства» ў Гомелі прымеркавалі адкрыццё мурала «Будучыня Беларусі ў тваіх руках». Як адзначыў на цырымоніі адкрыцця **першы сакратар Цэнтральнага камітэта ГА «БРСМ» Аляксандр ЛУК'ЯНАЎ**, ужо стала традыцыяй пачынаць другі дзень «Марафону адзінства» з адкрыцця арт-аб'екта. Па яго словах, падобныя муралы з'явяцца ва ўсіх гарадах па маршруце акцыі. У горадзе над Сожам новы арт-аб'ект упрыгожыў сцяну жылога дома па вуліцы Ланге. Актыўны ўдзел у рэалізацыі гэтага праекта прымала моладзь.

— Мы заўжды чакаем прапаноў ад моладзі. І вось адной з іх стала размяшчэнне арт-аб'екта насупраць сквера Дружбы, каля адной з вядучых ВНУ нашай краіны — Гомельскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта. Вялікая колькасць мерапрыемстваў штогод праходзіць менавіта тут, — звярнуў увагу першы сакратар Цэнтральнага камітэта ГА «БРСМ». Аляксандр Лук'янаў зазначыў, што арт-аб'ект «Будучыня Беларусі ў тваіх руках» таксама распрацаваны маладымі актывістамі.

— Адзінства ўсяго грамадства пачынаецца перш за ўсё з сям'і. Вядома, у дзяржаве робіцца шмат для падтрымкі маладых сем'яў, для таго каб яны з упэўненасцю рабілі першы крок на шляху стварэння сям'і, — дадаў лідар БРСМ. — Як дакладна падкрэслівае наш Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, беларусы самі вызначаюць свой лёс. Кожны дзень мы робім выбар, дзе знаходзіцца, чым займацца, дзе працаваць. Ад нашага выбару, ад нашай самаадданасці на рабочым месцы, ад шчырых адносін, дружбы паміж людзьмі залежыць і будучыня. І, вядома, будучыня найперш у сям'і, у нашых дзецях.

Важныя сустрэчы

Усе, каму цікавая тэма развенчвання фэйкаў, верыфікацыі і крытычнай ацэнкі інфармацыі, супрацьстаяння інфармацыйным правакацыям, змаглі абмеркаваць хвалюючую праблематыку з **міністрам інфармацыі Беларусі Маратам МАРКАВЫМ** і **палітычным аглядальнікам тэлеканала АНТ Ігарам ТУРАМ.** Кіраўнік Мінінфарма і адзін з вядучых журналістаў Прэзідэнцкага пула сталі гасцямі «Знакавай сустрэчы» ў Гомелі — адной з лакацый насычанай праграмы акцыі «Марафон адзінства». Каб пачуць выступленне Марата Маркава і Ігара Тура ў адным з гандлёва-забаўляльных цэнтраў Гомеля, сабраліся гамяльчане і жыхары рэгіёна розных пакаленняў. «Знакавая сустрэча» праходзіла ў фармаце медыясняданку. Дзякуючы адкрытаму і даступнаму фармату зносін госці слухалі і задавалі спікерам хвалюючыя пытанні. Гэта аказалася вельмі важным, бо на простых прыкладах з жыцця абмяркоўвалі тое, што датычыцца кожнага беларуса.

Разглядалі на сустрэчы рэальныя сітуацыі ў інфармацыйным асяроддзі не толькі нашай краіны, але і замежжа. Спікеры прадэманстравалі, якім чынам сучасныя тэхналогіі дапамагаюць ствараць фэйкі і для чаго гэта ўвогуле робіцца.

Як зазначыў Марат Маркаў, тэхналогіі і тэхнічныя магчымасці скажонай падачы інфармацыі ў медыяпрасторы сёння развіваюцца вельмі хутка.

— Успомніце, што адбывалася ў 2020 годзе, калі нас проста нашпігоўвалі фэйкамі такім чынам, каб сфарміраваць эмоцыю, — нагадаў міністр інфармацыі. — Кожны раз, калі вы будзеце бачыць які-небудзь відэа- ці фотаматэрыял, што выклікае каласальныя перажыванні, задумайцеся, уключыце крытычнае мысленне. Трэба разумець, што дзякуючы сучасным тэхналогіям можна прымусіць любога палітыка гаварыць і рабіць тое, што неабходна стваральніку фэйкаў. Людзі будуць гэтаму верыць, што можа стаць пабуджальным матывам для здзяйснення пэўных дзеянняў, — звярнуў увагу Марат Маркаў.

Ён падкрэсліў, што за крыху больш чым чатыры гады, якія прайшлі пасля выбараў 2020 года, наша краіна, грамадства адолелі сур'ёзны шлях з пункту гледжання разумення тэхналогій, якія могуць выкарыстоўвацца ў медыясферы.

Адно з пытанняў, якое адрасавалі госці спікерам, датычылася таго, як даносіць праўду і абараніць ад фэйкаў пажылых людзей і дзяцей.

Марат Маркаў і Ігар Тур заўважылі, што адназначна няма і быць не можа ўніверсальных правілаў, алгарытмаў абароны ад фэйкаў. Сёння галоўнае, каб у людзей узнік інтарэс да гэтай праблематыкі, шчырае жаданне разабрацца.

— Мы жывём у такі час, калі ўсе нас спрабуюць падмануць. Трэба спрабаваць станавіцца разумнейшымі і разбірацца больш у розных пытаннях, да чаго мы заўсёды наша грамадства і заклікаем. Сумнявацца, уключаць крытычнае мысленне, чытаць, цікавіцца многім. Калі ты многае ведаеш, у цябе з'яўляецца больш пытанняў да таго, што табе спрабуюць, шчыра кажучы, уцюхаць, — заклікаў гасцей сустрэчы Ігар Тур.

УДЗЕЛЬНІКАЎ «МАРАФОНУ АДЗІНСТВА»

Міністр інфармацыі Беларусі ў сваю чаргу прывёў прыклад стварэння фэйкаў — шматлікія махлярскія схемы.

— Чалавеку расказваюць казкі, ён здзяйсняе пэўныя дзеянні. У нас была сітуацыя, калі адзін з вядучых расказваў з экрана аб канкрэтным выпадку, аб новай сістэме махлярства, але роўна праз пяць хвілін пасля эфіру яму патэлефанавалі, і ён папаўся, — распавёў Марат Сяргеевіч.

Пасля сустрэчы журналісты пацікавіліся меркаваннем кіраўніка Мініінфарма, ці вераць, сёння беларусы фэйкам або ўжо «прывітыя» ад правакацыі і здольныя прасейваць «інфармацыйны бруд».

— Гэта вельмі індывідуальна, таму што людзі розныя. Некаторыя пачынаюць разбірацца ў інфармацыі, і гэта толькі ідзе ім на карысць, — адзначыў міністр. — Калі мы не будзем разбірацца ў тым, чым нас часам спрабуюць нашпігаваць, а, як правіла, гэта робіцца, каб дагадзіць чаму-небудзь ці каму-небудзь, то, магчыма, мы проста страцім краіну. Вось гэта будзе страшна, — перасцярог Марат Маркаў.

Ён падкрэсліў, што ў працэсе супрацьстаяння фэйкам важная самаадукацыя, лікбез, які павінен заўжды праходзіць.

— Бо кожная новая тэхналогія дае новыя магчымасці, а з другога боку — і новыя праблемы, і калі ты не будзеш у ёй разбірацца, то будуць праблемы, а калі навучышся — магчымасці, — зазначыў міністр.

Марат Маркаў нагадаў, што ў гэтым годзе ў медыяпрасторы Беларусі — два новыя інфармацыйныя інструменты: канал навін «Першы інфармацыйны» і мультымедыйны партал VIDEOBEL.BY.

— Гэта ўжо кажа аб тым, што мы дастаткова сур'ёзна падыходзім да гэтых пытанняў. Але мы заўсёды будзем не задаволены тым, што маем на сёння. І гэта добра, бо як толькі палічым, што ўжо зрабілі дастаткова, мы прайграем. У 2025 годзе я хацеў бы паглядзець на журналістаў, як вы будзеце ўстойліва рэагаваць на фэйкі, якія будуць укідваць. Бо ў 2020 годзе, на жаль, некаторыя прафесіяналы, нашы з вамі калегі не разабраліся ў сітуацыі, не змаглі зразумець, што іх проста дураць, а ў выніку атрымалі тое, што ёсць: хтосьці — месцы не настолькі аддаленыя, а хтосьці — чужую радзіму. Для таго, каб гэтага з намі не здаралася, мы павінны быць прафесіяналамі. Гэта датычыцца кожнага, — рэзюмаваў Марат Маркаў.

Квэсты, майстар-класы і фудкорты

У рамках рэспубліканскай грамадска-культурнай акцыі прайшоў патрыятычны квэст «Гэта ўсё маё, роднае», 40 удзельнікам якога неабходна было прайсці дзесяць «станцый» з інтэлектуальнымі і творчымі заданнямі па розных тэмах. Прызы пераможцаў атрымалі тры каманды. Лідарамі сталі каманда прадстаўнікоў «Белдзяржстраха», супрацоўнікі прадпрыемства «Гомельшкло» і работнікі Гомельскай абласной клінічнай паліклінікі. Каманда агенцтва «Мінск-Навіны» заваявала на патрыятычным квэсце прыз сімпатый гледачоў за найлепшы танец у адным з заданняў.

Увогуле, пляцоўка перад Лядовым палацам у Гомелі, дзе разгарнуліся лакацыі «Марафону адзінства», ператварылася ў святочны цэнтр імправізаваных падворкаў прадпрыемстваў Гомельшчыны і зон для майстар-класаў.

Кульмінацыяй акцыі стаў святочны канцэрт «Час выбраў нас». Як рыхтавалася маштабнае культурнае шоу і якія ідэі натхнялі на творчасць артыстаў канцэрта, журналістам распавёў **дырэктар Палаца Рэспублікі, прадстаўнік рабочай групы па арганізацыі і правядзенні «Марафону адзінства» Максім ПРЫХАДОЎСКІ.** Па яго словах, фінальны канцэрт у кожным з пунктаў маршруту не будзе паўтарацца. Праграма «Час выбраў нас» у Гомелі — своеасаблівы сімбіёз культуры Гомельшчыны і іншых рэгіёнаў.

— У Гомелі гледачы пачулі голас Палесся, прагучала і ода Гомелю. Сюды прыехалі маленькія зорачкі з Магілёва, дзякуючы

ім вядомы «Бульба-дэнс» зайграў новымі фарбамі. Тое ж можна сказаць і аб фінальным нумары, які быў выкананы ў Палацы Рэспублікі ў рамках акцыі «Беларусь — мая песня». На канцэрце ў Гомелі гэта ўжо абсалютна новыя рыскі, якія дазволілі паказаць гомельскую ідэнтычнасць. Хочацца, каб кожны па-сапраўднаму адчуў, што мы адзіныя, бо «Марафон адзінства» — гэта падарунак для ўсіх жыхароў рэгіёна, — падкрэсліў дырэктар Палаца Рэспублікі.

Максім Прыхадоўскі выказаў падзяку вялікай камандзе арганізатараў і ўдзельнікаў марафону.

— Не абыходзіцца без удзелу Адміністрацыі Прэзідэнта, Міністэрства культуры, Міністэрства адукацыі, БРСМ... І без падтрымкі на месцах — аблвыканкама, гарвыканкама — немагчыма было б зрабіць тое, што робім, — дадаў прадстаўнік рабочай групы па арганізацыі і правядзенні «Марафону адзінства».

Максім Прыхадоўскі падкрэсліў, што арганізатары падрыхтавалі ўнікальную праграму і для чарговага горада на шляху рэспубліканскай грамадска-культурнай акцыі — сталіцы металургаў — Жлобіна.

— Не хацелася б раскрываць усе сакрэты і сюрпрызы. Нешта асаблівае будзе дакладна. Усіх чакаюць цікавыя сустрэчы, акцыі, праекты і канцэртныя нумары. Мы імкнёмся максімальна ярка і па-асаблівому раскрыць усе гарады, якія будуць у маршруце «Марафону адзінства». Жлобінцы, рыхтуйцеся! — заклікаў Максім Прыхадоўскі.

Нацыянальны брэнд Беларусі

Уражаннямі ад праграмы марафону падзяліўся **намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Дзмітрый АЛЕЙНІКАЎ.**

— Увесь горад ахоплены эмоцыямі «Марафону адзінства». Гэта сапраўднае яднанне народа. Прыгожае мерапрыемства, вялікая колькасць людзей, нестандартныя падыходы. Прайшлі экскурсіі па брэндавых прадпрыемствах. Ім было прыемна паказаць сваю дзейнасць і прадэманстраваць, што яны таксама працуюць на карысць краіны. Магу ўпэўнена сказаць, што працаўнікі ўсёй Гомельскай вобласці паказваюць даволі паспяховыя вынікі на працягу ўсіх 30 гадоў. Лічу, што «Марафон адзінства» ў Гомелі атрымаўся.

На адкрыцці канцэрта жыхароў і гасцей Гомельшчыны прывітаў **кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Дзмітрый КРУТОЙ.** Ён перадаў самыя шчырыя, добрыя пажаданні і словы прывітання ад Прэзідэнта Беларусі.

— «Марафон адзінства» — гэта падарунак Прэзідэнта ўсім жыхарам Беларусі. Літаральна тыдзень таму наш лідар актыўна працаваў на Гомельшчыне, наведваў фестываль працаўнікоў вёскі «Дажынкі» ў Кармянскім раёне. Там яшчэ раз успамінаў нашу суверэнную гісторыю, расказваў, з якой цеплынёй, спагадлівасцю гамяльчане ставяцца да яго на пасадзе Прэзідэнта, паверылі 30 гадоў таму маладому кіраўніку рэспублікі, што ён не пакіне іх сам-насам з чарнобыльскімі праблемамі, адтокам насельніцтва, беспрацоўем, заняпадам палескіх раёнаў і іншымі цяжкасцямі, якія былі ўжо ў суверэннай краіне, якая яшчэ толькі-толькі станавілася на ногі. Наш Прэзідэнт неаднаразова казаў, ні ў якім выпадку не крыўдзячы іншыя рэгіёны нашай краіны, што на Гомельшчыне жывуць яго самыя адданыя выбаршчыкі, сапраўдныя людзі, якія ніколі яго не падводзілі. І ён таксама вас ніколі ні ў чым не падводзіў і не падвядзе ў будучыні, — падкрэсліў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

Дзмітрый Крутой зазначыў, што Гомельшчына займае дастойнае месца ў краіне і па эканоміцы, і па сацыяльнай сферы, і па іншых кірунках.

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта нагадаў, што рэспубліканская грамадска-культурная акцыя «Марафон адзінства» ахопіць самыя розныя населеныя пункты краіны. Па словах Дзмітрыя Крутога, акцыя можа стаць знакавым нацыянальным брэндам Беларусі.

— Дай Бог, каб «Марафон адзінства» стаў такім жа знакавым нашым нацыянальным брэндам, як фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» ці «Дажынкі». І глыбока сімвалічна, што ў Гомелі мы з вамі сустракаемся паміж Днём маці і Днём бацькі, яшчэ раз паказваючы непахіснасць сям'і як галоўную аснову, галоўную апору беларускага грамадства, — падкрэсліў Дзмітрый Крутой. — Давайце паважаць, беражны нашы каштоўнасці, падтрымліваць нашу культуру, шанаваць нашу гісторыю і захоўваць адзінства нашай нацыі перад абліччам любых цяжкасцяў. І тады ўсё ў нас атрымаецца.

На канцэрце «Час выбраў нас» да сваіх землякоў звярнулася **старшыня Пастаяннай камісіі па экалогіі і прыродакарыстанні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі,** ураджэнка Хойніцкага раёна Гомельшчыны **Жанна ЧАРНЯЎСКАЯ.**

— Калі мне не было яшчэ і 15 гадоў — здарылася вялікая бяда, якая закранула кожнага беларуса, — аварыя на Чарнобыльскай АЭС. Гомельская вобласць, як і мой родны раён, прынялі асноўны ўдар радыяцыі. Было страшна, незразумела, але мы справіліся і пачалі будаваць суверэнную і незалежную краіну. Шмат сіл уклаў наш Прэзідэнт, каб пераадолець наступствы і адрадзіць гэтыя землі. Нам удалося многае. І сёння мы не спыніліся на дасягнутым, — падкрэсліла дэпутат. — Магу сцвярджаць, што Беларусь — гэта краіна магчымасцяў. Пры жаданні кожны чалавек можа рэалізаваць тут сваю мару, толькі трэба прыкласці намаганні. Любоў і праца дапамогуць забяспечыць выкананне нашых жаданняў. Вядома, мы ўсе вельмі рознымі. У кожнага — свае погляды, свая жыццёвая гісторыя, свае радасці і засмучэнні, свае перамогі і дасягненні. Але нас аб'ядноўвае агульная мэта — усе мы хочам мірнага і шчаслівага жыцця для сябе і для будучых пакаленняў. Нам ёсць чым ганарыцца, што захоўваць і дзеля чаго змагацца! — падкрэсліла Жанна Чарняўская.

Са святочнай сцэны «Марафону адзінства» жыхароў і гасцей Гомельшчыны прывітаў і першы **намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Дзмітрый ПЕТРАЖЫЦКІ.**

— Мы апрацоўваем палі, узводзім будынкі, мы працуем каля канвеера ці каля станка. Мы вучым, мы кормім, мы апранаем, мы лечым. Ставім новыя працоўныя, спартыўныя рэкорды. А яшчэ мы ўмеем любіць і абараняць нашы сем'і і нашу краіну. І намі кіруе любоў да нашай Радзімы. А значыць, патрыятызм — гэта і ёсць адзінства людзей, якія жывуць у нашай краіне, — зрабіў акцэнт Дзмітрый Петражыцкі.

Першы намеснік старшыні аблвыканкама адзначыў, што кожны год на Гомельшчыне ў кнігу «Чалавек года» ўносяць імёны дастойных працаўнікоў рэгіёна.

